ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 101 (2461)
23 снежня 1969 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ДНІ БЕЛАРУСКАЙ НАВУКІ Ў МАСКВЕ

Сёння ў сталіцы нашай Радзімы — Маскве пачынаюцца Ленінскія дні навукі БССР, прысвечаныя 100-годдзю з дня нараджэння правадыра рэвалюцыі.

На працягу пяці дзён масквічы і іх госці змогуць пазнаёміцца з дасягненнямі беларускай навукі, народжанай Вялікім Кастрычнікам, будуць мець сустрэчы з вучонымі, якія прадстаўляюць 28 ВНУ і звыш 170 галінавых навуковых устаноў нашай рэспублікі.

Адбудуцца сустрэчы пасланцоў братняй Беларусі з працоўнымі Пралетарскага і Чырвонагвардзейскага раёнаў сталіцы, з калектывамі прамысловых прадпрыемстваў, навучальных і навуковых устаноў, з воінамі Савецкай Арміі, калгаснікамі Падмаскоўя.

Сярод шматлікіх мерапрыемстваў семінара-нарады творчай моладзі ў Наваполацку была і паездка ў старажытны Полацк — пазнаёміцца з помнікамі старажытнага дойлідства. Там, каля сцен Сафіі, і зроблены фотакарэспандэнтам Рыгорам Кадзетам гэты здымак: доктар архітэктуры У. Чантурыя расказвае ўдзельнікам семінара пра мастацкія вартасці славутага помніка.

САВЕЦКАМУ ТЭАТРУ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ 50 ГАДОЎ

СВЯТА ЗАСТАЕЦЦА З ТАБОЙ

Ад 4 да 70...

У дні, калі святкуецца пяцідзесяцігоддзе савецкага дзіцячага тэатра, наш карэспандэнт пабываў у Беларускім ТЮГу і пагутарыў з гледачамі пра гэты юбілей.

САВЕЦКАМУ дзіцячаму тэатру — 50 гадоў. Зараз ужо немагчыма ўявіць сабе карціну сучаснага тэатральнага мастацтва без уліку таго, што зроблена і робіцца тэатрамі для юных. Савецкі дзіцячы тэатр не толькі трывала заваяваў права грамадзянства ў сацыялістычным мастацтве, але і заняў пачэснае месца ў ідэйным, маральным і эстэтычным выхаванні маладога пакалення.

З адлегласці часу яшчэ выразней відаць, якую вялікую справу рабілі тыя, хто ўпершыню ў свеце закладваў асновы тэатра новага тыпу, вызначаў яго эстэтычныя і выхаваўчыя прынцыпы.

Першыя паслярэвалюцыйныя гады... Маладая Савецкая рэспубліка рве кальцо ворожай блакады, вядзе цяжкую барацьбу з сіламі ўнутранай контррэвалюцыі. І тады ж Савецкая дзяржава стварае першыя тэатры для дзяцей. Гэтым займаецца па даручэнні У. І. Леніна народны камісар асветы А. В. Луначарскі. І ўжо само гэта красамоўна сведчыць, якое значэнне надавала партыя ўсебаковаму выхаванню юнай рэвалюцыйнай змены.

УЗРОСТ СТАЛАСЦІ

Артур ВОЛЬСКІ,
дырэктар Рэспубліканскага тэатра юнага гледача

З асаблівай пашанай прыгадваем мы сёння пачынальнікаў тюгаўскага руху, дзякуючы творчым намаганням якіх савецкія дзеці прыйшлі на першыя прэм'еры ў свой тэатр. І тут мы не можам не адзначыць тую вялізную ролю, якую адыграў у распрацоўцы мастацка-педагагічных прынцыпаў тэатра для дзяцей заснавальнік Ленінградскага ТЮГа народны артыст СССР А. А. Брэнцаў. І сёння тэатры юнага гледача ў сваіх пошуках зноў і зноў звяртаюцца да яго тэарэтычнай і практычнай спадчыны. «Брэнцаўскія чытанні», якія штогод праводзяцца ў розных гарадах краіны, ператвараюцца ў сапраўдную школу пазнання інтарэсаў сённяшняга юнага гледача і прафесійнага майстэрства тых, хто працуе ў мастацтве для дзяцей.

50 гадоў — узрост сталасці. І трэба сказаць, што ў дзіцячых тэатрах ёсць нямала здабыткаў. Дзякуючы сіле свайго эмацыянальнага ўздзеяння, яны актыўна ўплываюць на фарміраванне светапогляду, маральных якасцей, выхоўваюць пачуццё грамадзянскага абавязку, высокія паняцці любві да Радзімы, да яе рэвалюцыйнай гісторыі.

Красамоўныя хаця б такія лічбы: сёння ў Савецкім Саюзе на 27 мовах братніх народаў працуюць 100 лялечных і 44 драматычныя тэатры для дзяцей. Штогод яны іграюць больш за 90 тысяч спектакляў, якія наведваюць 35 мільёнаў гледачоў.

Нам прыемна, што ў гэту магутную плынь уліваецца праца і нашага Беларускага тэатра юнага гледача. Наш тэатр усяго на дзесяць гадоў маладзейшы за старэйшыя дзіцячыя тэатры краіны. Упершыню ён узняў сваю заслону вясной 1931 года. Пачатак яго дзейнасці звязаны з імёнамі такіх вядомых рэжысёраў, як В. Кавязін, Е. Міровіч, М. Зораў. Пасля Вялікай Айчыннай вайны іх творчую эстафету пераняла заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Л. Мазалеўская. Разам з першым дырэктарам пасляваеннага беларускага ТЮГа заслужаным дзеячом мастацтваў рэспублікі Ул. Стэльмахам яна шмат зрабіла для стварэння сапраўды нацыянальнага дзіцячага тэатра, які настойліва шукаў і знаходзіў шляхі да сэрца юнага гледача.

Магчыма, адной з самых прывабных рыс нашага тэатра стала тое, што ў ім знайшлі сябе як драматургі тыя, хто да гэтага ніколі сур'ёзна не сутыкаўся з літаратурай для сцэны. Дзесяць год назад тады вядомы ўжо як празаік І. Шамякін прынёс у тэатр сваю першую п'есу «Не верце цішыні». А сёлета адбыўся своеасаблівы юбілей. У час летніх гастроляў у Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці мы адзначалі 500 спектакль па гэтай п'есе. Зараз у рэпертуары тэатра значыцца і другая п'еса І. Шамякіна — «Дзеці аднаго дома». Добрэ вядома нашаму гледачу імя І. Козела, аўтара дзвюх п'ес: «Папараць-кветка» і «Над хвалямі Серабранкі». Без перабольшання можна сказаць, што гэтыя творы нараджаліся ў сценах тэатра. Калі малады настаўнік з Маладзечаншчыны звярнуўся ў тэатр са сваёй першай п'есай, амаль ніхто не верыў, што з гэтага можа атрымацца сапраўдны драматургічны твор. Але Л. Мазалеўская ўбачыла ў далёка не дасканалым матэрыяле жывыя назіранні, добрае веданне народнага побыту, адчула дасціпнасць і сакавітасць мовы, праўдзівасць характараў. І вось, у выніку карпатлівай і настойлівай работы з драматургам, на сцэну прыйшлі героі, якія да гэтага часу хвалююць гледача. Калі б не такія ўважлівыя, добразычлівыя адносіны, магчыма і аўтар гэтых радкоў разам з паэтам П. Макалём не рызыкнуў бы ўзяцца за працу драматурга, і не была б напісана драматычная паэма «За лясамі дрымучымі», пастаўленая таксама Л. Мазалеўскай.

Настаўнік Я. Пасаў, журналіст Ул. Хазанскі, артыст А. Гутковіч, празаік В. Зуб — усе яны дэбютавалі са сваімі першымі п'есамі на сцэне Беларускага тэатра юнага гледача.

Сёння мы імкнёмся працягваць добрую традыцыю, пачатую Е. Міровічам і замацаваную Л. Мазалеўскай. І ў гэтым сэнсе цікавая гісторыя з п'есай В. Вольскага «Цудоўная дудка». Напісаная ў даваенныя гады і тады ж упершыню пастаўленая, яна зусім нядаўна набыла новае сцэнічнае жыццё, вытрымала каля ста спектакляў і прыцягвае ўсё новых гледачоў. І ў гэтым нельга не аддаць належнае пастаноўшчыку і мастаку спектакля заслужанаму дзеячу мастацтваў БССР А. Грыгар'янцу, які па-свойму прачытаў п'есу, знайшоў для яе арыгінальнае рэжысёрскае і выяўленчае рашэнне.

Наўрад ці трэба гаварыць, з якімі цяжкасцямі звязана праца па стварэнні нацыянальнага рэпертуару. Кожны раз, пачынаючы работу над новым творам свайго аўтара, мы, натуральна, ідзём на пэўнае рызыку. Куды спакайней браць п'есы, апрабіраваныя ў Маскве ці ў Ленінградзе! І тым не менш мы рызыкуем. А як жа інакш? Менавіта п'есы сваіх аўтараў атрымліваюць найбольш доўгае сцэнічнае жыццё. Мы разумеем, што гэта адбываецца не за кошт іх асаблівых мастацкіх вартасцей, а перш за ўсё таму, што ў іх адлюстроўваюцца падзеі, звязаныя з гістарычным мінулым і сённяшнім днём рэспублікі. Якраз па гэтай прычыне і зацікавілі тэатр гістарычная хроніка Ул. Мехава «Чырвоны губернатар», у цэнтры якой вобраз легендарнага камісара грамадзянскай вайны Станіслава Берсана, і лірычная драма М. Алтухова і Б. Бур'яна «Зорка Венера» пра выдатнага беларускага паэта Максіма Багдановіча.

Аддаючы вялікую ўвагу стварэнню нацыянальнага рэпертуару, мы стараемся, каб лепшыя творы рускай і замежнай класікі, а таксама сучаснай драматургіі савецкіх рэспублік і іншых народаў не абміналі нашай сцэны. Так у нашым рэпертуары з'явіліся ў апошні час «Ваўкі і авечкі» А. Астроўскага ў пастаноўцы маладога рэжысёра Т. Белічэнка, «Тры мушкецёры» ў пастаноўцы ленінградскага рэжысёра М. Рэхельса, казка па аповесці шведскай пісьменніцы А. Ліндгрэн «Малыш і Карлсан, які жыве на даху» у пастаноўцы ўкраінца Леся Танюка, вадэвіль югаслаўскага драматурга М. Мітравіча «Аграбленне апоўначы», які паставіла дыпламантка нашага тэатральнага інстытута Л. Тарасава.

Як і ўсе тэатры, з асаблівым натхненнем працуе наш калектыў, рыхтуючыся да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. І тут мы застаемся вернымі сваёй традыцыі. У нашу юбілейную афішу побач з такімі назвамі, як «Неспакойная старасць» Л. Рахманава, работу над якой заканчвае ў гэтыя дні галоўны рэжысёр тэатра Б. Ганага, і «Бялее парус адзінокі» В. Катаева, увойдуць п'есы, створаныя беларускімі драматургамі ў цеснай сядружнасці з тэатрам. Ужо ўбачыў святло рампы спектакль «Палёт» па драматычнай навеле Ул. Мехава аб духоўнай эстафеце пакаленняў, аб вернасці тым, хто ў гады Вялікай Айчыннай вайны аддаў жыццё за наша сёння. Доўгі час працуе тэатр з пісьменнікам В. Зубам над дакументальнай драмай аб юнацтве нашага выдатнага земляка Ф. Э. Дзяржынскага. І мы верым, што гэты спектакль з'явіцца дастойным падарункам слаўнаму юбілею.

Папаўняе тэатр і рэпертуар для самых маленькіх. У час зімовых канікулаў школьнікі ўбачаць спектакль па п'есе Петруся Макаля «Адчыніце, казляняткі!» Нам думаецца, што гэта пастаноўка, у якой паэтычна пераасэнсоўваецца сюжэт вядомай народнай казкі, зацікавіць не толькі маленькіх.

А што наперадзе? Планы — самыя шырокія. Мы марым пра тое, што на нашу сцэну прыйдуць Рамео і Джульета, Тыль Уленшпігель, героі Брэхта, Несцерка і Міколка-паравоз, Вася Вясёлкін з паэтычных казак В. Віткі і многія іншыя літаратурныя персанажы, якія палюбіліся дзецям і юнацтву.

У тым, што ў гэтыя дні так шырока адзначаецца ў нашай краіне юбілей дзіцячага тэатра, мы бачым працяг ленінскага клопату аб дзецях, аб нашай слаўнай моладзі, аб мастацтве, якое выхоўвае іх.

Юбілей — не толькі позірк на пройдзенае. Гэта яшчэ і старт у будучыню. Акрыленыя клопатам дзяржавы, мы, работнікі дзіцячага тэатра, зробім усё, каб на сустрэчу з нашым юным гледачом на сцэну выходзіў герой, які б стаў сапраўдным узорам патрыятычнага служэння Радзіме, вернасці ідэалам камунізма, барацьбы за новага чалавека.

РАЗАМ З ЎНУКАМІ

А. П. ПРОХАРЧЫК,
пенсіянер,
былы партызан Айчыннай вайны

— Той факт, што вы сёння сустрэлі мяне ў тэатры,— выпадковы. Не тыя гады, каб хадзіць у дзіцячы тэатр. Проста мяне выцягнулі з дома ўнукі. Але павінен вам сказаць, што з тэатрам юнага гледача мяне звязвае даўняя дружба.

Было гэта яшчэ ў 1936 годзе, калі наша вайсковая часць стаяла не вельмі далёка ад Мінска. Аднойчы, толькі мы сабраліся ісці вячэраць, як камандзір роты аб'явіў, што да нас прыехалі артысты з Мінска. Гэта былі тюгаўцы.

Спектакль яны ў той вечар нам не паказвалі. Быў канцэрт, які вельмі спадабаўся нашым хлопцам. У канцы вечара запрасілі акцёраў завітваць да нас у госці часцей. З гэтага і пачалося...

А потым вайна. З Беларускім тэатрам для юных даводзілася сустрэцца толькі ў сярэдзіне пяцідзесятых.

Вельмі запомніўся мне спектакль па п'есе Івана Козела «Папараць-кветка». Нібы дзяцінствам на мяне патыхнула. Гэта ж трэба так добра ведаць сялянскі побыт беларусаў! Амаль што пабываў у роднай вёсцы, пачуў знаёмыя імёны, пабачыў дарагія мясціны.

А потым і ўнукі падраслі. Гэта ўжо заўзятыя тэатралы. Відаць, няма такога спектакля ў тэатры, якога б яны не паглядзелі. Дадому прыходзяць радасныя, узрушаныя. Дачка, дык тая іх да паўночы спаць не можа ўкласці. Усё шэпчуцца, спрачаюцца, уражаннямі абменьваюцца...

ДА НОВЫХ СУСТРЭЧ!

Оля СЯМЕНАВА,
вучаніца Пухавіцкай сярэдняй школы

— Вельмі зайздрошчу тым, хто жыве ў Мінску. Гэта ж толькі падумаць, амаль кожны дзень яны могуць прыйсці ў тэатр! Але не падумайце, што нам не шчасціць. Наша настаўніца Надзея Сяргееўна кожны месяц бярэ для нас білеты ў тэатр. Ну, канечне, мы вельмі любім ТЮГ, і калі б мы ні прыехалі туды, гэта сапраўднае свята.

Першы спектакль, які я паглядзела ў тэатры юнага гледача, — «Прыгоды Чыпаліна». Было гэта гадоў пяць назад. Потым я доўга не магла забыць герояў, якія мне так палюбіліся. А ад малодшай сястрычкі не было адбою. Раскажы ды раскажы пра Чыпаліна.

Не так даўно мы прыязджалі ў ТЮГ на спектакль па п'есе Івана Шамякіна «Дзеці аднаго дома». А да гэтага мы ўсім класам чыталі кнігу гэтага пісьменніка «Глыбокая плынь». Яна нам вельмі спадабалася. Таму і пачуцці, з якімі мы прыйшлі ў глядзельную залу, былі самымі прыемнымі. Павінна сказаць, што з першай жа карціны мы аказаліся ўцягнутымі ў тое, што адбывалася на сцэне. Нас вельмі зацікавілі хлопчыкі і дзяўчынкі, якія ў глыбокім тыле ворага засталіся сапраўднымі піянерамі-патрыётамі.

Пасля спектакля мы сустрэліся з акцёрамі, занятымі ў спектаклі. Гэта была вельмі цікавая сустрача. Мне нават часам здавалася, што сярод нас знаходзяцца тыя самыя хлопцы і дзяўчаты, якія былі ў вайну.

Праз некалькі гадзін мы паедзем дадому. Але мы яшчэ не раз прыедзем на спатканне з любімым тэатрам. І яшчэ нам вельмі прыемна ад таго, што мы пабылі ў тэатры ў святочны для яго дзень. Бо свята тэатра — наша свята!

НАШ ДОБРЫ ПАМОЧНІК

Н. Г. САЛАЎЁВА,
заслужаная настаўніца БССР

— Тэатр, як і школа, адказвае за мастацкі густ моладзі, за яе адносіны да людзей, да жыцця, да маральных праблем. Тое, што мы расказваем на ўроках, ажывае ў мастацкіх вобразах на сцэне.

Аднойчы я стала сведкай, на першы погляд, зусім звычайнай гутаркі маіх выхаванцаў напярэдадні калектыўнага паходу ў Тэатр юнага гледача на адзін з апошніх спектакляў. Невялічкі, віхрасты хлапчук Толік Галаванаў узрушана гаварыў свайму сябру:

— Ідзеш у тэатр, а наравікі як у мурзілкі. Гэта ж свята, а ты...

Вось тут я яшчэ раз змагла пераканацца, што значыць для моладзі тэатр. У хлапчука ўжо з дзіцячых гадоў праўлялася такая глыбокая павага да яго, што ён не мог дазволіць сабе і свайму сябру зняважыць сваё любімае захапленне.

Дарэчы, як я ўжо змагла пераканацца за гады сваёй педагагічнай працы, такія хлапчукі і дзяўчынкі складаюць большасць. Тэатр дапамагае ім акрэсліць і свой далейшы жыццёвы шлях. Ён для іх, як той цудоўны палац, дзе яны заўсёды могуць сустрэцца з нечым новым, незвычайным, прывабліым. І разам з гэтым святам яны атрымліваюць эмацыянальныя ўрокі жыцця.

Аднойчы пасля спектакля ў нашым ТЮГу намеснік дырэктара С. Бялевіч спытаў мяне:

— Ніна Герасімаўна, вось, прачытайце, — і працягвае мне невялічкую паштоўку. Мне запомнілася апошняя фраза: «Дзякуй за тую любоў да жыцця, якой я ў вас навучыўся...»

Чытаю подпіс, і — вось табе на... Гэта ж піша мой былы вучань Алесь Парахневіч! І паверыце—да таго мне прыемна было ў тую хвіліну, што аж слёзы на вочы навярнуліся. Хлопчык звяртаўся да любімага тэатра, як да шчырага сябра! А можа гэта было развітанне з дзяцінствам?!

Большасць спектакляў, якія мне давялося глядзець у тэатры юнага гледача, прысвечана тэмам сучаснасці, тэмам, якія хвалююць моладзь, і калі ў наступны пасля спектакля дзень прыходзіш у клас, колькі гарачых спрэчак сярод вучняў. Адным падабаюцца (або не—і так бывае) акцёры, другія дэталёва разбіраюць сюжэт, трэція параўноўваюць убачанае ў тэатры з апошнімі кінастужкамі. І ўсё ж сыходзяцца ў адным— мастацтва тэатра ім вельмі падабаецца.

■

...Гутарыш з адным, з другім, і амаль кожны з тых, хто сёння завітаў на гасцінны «агеньчык» тюгаўскага палаца на вуліцы Энгельса, не тоіць добрай усмешкі: так, тэатр гледачам падабаецца. Каб не псаваць юбілейнага настрою, той-сёй з гледачоў гаворыць: «Ну, пра недахопы, мабыць, не варта цяпер...» Недахопы, вядома, ёсць. Некаторыя лічаць, скажам, што ў тэатры значна часцей адбываюцца прэм'еры спектакляў для гледачоў старэйшых узростаў, чым для малодшых. «ТЮГ» наш, як быццам, ганяецца за «дарослай» аўдыторыяй.

Але я гляджу на афішу і бачу, што гэта не зусім праўда: ёсць на афішы і казка, і прыгодніцкія творы, і дзіцячыя сюжэты. Так што, бадай, лепш не скажаш, як на адной са старых афіш спектакля «Прыгоды Бураціна»: «Прадстаўленне для юных гледачоў ад 4 да 70 год».

С. ВІКТАРАЎ.

«МНЕ СПАДАБАЛАСЯ. ДЗЯКУЙ...»

...І раптам выходзіць воўк.

Фота Ул. КРУКА.

Маленькая Таня толькі што навучылася пісаць друкаваныя літары. Паглядзеўшы спектакль-казку «Па шчупаковым загадзе», дзяўчынка напісала: «Мне спадабалася. Дзякуй. Таня».

А вось другі запіс—Вадзіма Гушакова: «Мне спадабаўся «Кот у ботах». Юны глядач тут жа малюе бравага Ката—са шпагай, капелюшом, пяром і ў вялікіх ботах.

І яшчэ адзін водгук — хлопчыка Андрэйкі Ісачанкава: «Мне вельмі спадабаўся б «Кот у ботах», калі б я яго ўбачыў. Але я ўвесь час бачыў гэта...» І хлопчык намаляваў рады крэслаў, на якіх сядзяць мамы з высокімі моднымі прыноскамі, папы, дзядулі і бабулі. А за імі хлопчык, які выцягвае тоненькую шыйку, але дарма... І ўсё ж Андрэйка аптыміст, бо закончыў ён свой водгук словамі: «У наступны раз я буду сядзець на першым радзе. А наогул дзякуй!»

Гэтыя ўражанні пакінулі ў кнізе водгукаў юныя гледачы Кіева, калі летам там гастраляваў Дзяржаўны тэатр лялек БССР. Каля 90 спектакляў паказалі беларускія лялечнікі. І ўсе яны прайшлі пры поўных аншлагах.

Любяць свой тэатр і маленькія мінчане. Кожнае выступленне яго артыстаў—сапраўднае свята для дзяцей. Тут нараджаецца любоў да мастацтва, да тэатра.

Розныя гэта спектаклі, і нарадзіліся яны ў розных краінах: адны пра звяроў, другія—пра людзей. Казка «Дзед і журавель» — у Беларусі, «Золушка»—у Францыі, «Іван Царэвіч і Шэры Воўк» у Расіі, «Заечая школа»—у Балгарыі, «Беласнежка і сем гномаў»—у Германіі, «Арэхавы пруток»—у Румыніі, «Тыграня Петрык»—у Польшчы. Выбірайце любую, на любы густ і на любы ўзрост.

Лялечны тэатр мае ў сваім рэпертуары і творы беларускіх аўтараў. Гэта — «Сярэбраная табакерка» (паводле Зм. Бядулі) і «Лясун» М. Алтухова, «Лянівае царства» М. Майсеевай, «Марынка-крапіўніца» А. Вольскага і П. Макаля, «Лясная хатка» П. Данілава і інш. А хутка юныя мінчане ўбачаць новы беларускі спектакль «Ліпавічкі» (паводле У. Галубка) А. Ляляўскага.

За час свайго існавання тэатр паказаў маленькім гледачам звыш 80 спектакляў. Штогод іх глядзяць звыш 25 тысяч дзяцей. За 19 гадоў у тэатры пабывала каля 15 мільёнаў гледачоў.

ЛЕНІНСКАМУ ЮБІЛЕЮ— ТВОРЧАСЦЬ МАЛАДЫХ

З РЭСПУБЛІКАНСКАГА СЕМІНАРА ТВОРЧАЙ МОЛАДЗІ

АДМЕТНАЯ асаблівасць гэтага рэспубліканскага семінара творчай моладзі ў тым, што ён адбыўся ў адным з самых маладых і самых буйных індустрыяльных цэнтраў рэспублікі—Наваполацку. Вельмі хораша, што менавіта ў гэтым горадзе сабраліся маладыя літаратары, кампазітары, мастакі, кінематаграфісты, архітэктары, акцёры і рэжысёры, фотамайстры, журналісты, каб абмяняцца думкамі аб увасабленні ленінскіх прынцыпаў партыйнасці і народнасці ва ўсіх сферах творчай дзейнасці. Вельмі хораша, што ў час натхнёнай падрыхтоўкі да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна творчая моладзь атрымала магчымасць не толькі прыняць удзел у таварыскіх дыскусіях па важнейшых праблемах савецкага мастацтва, сустрэцца са старэйшымі калегамі па творчым цэху, але і на поўныя грудзі ўдыхнуць паветра імклівага жыцця. Яно ў атмасферы маладога Наваполацка адчувальнае неяк па-асаблівому. Знаёмства з Наваполацкам і яго людзьмі, паездкі ў калгасы і сустрэчы з чытачамі ў кнігарні, удзел у канцэртах для навапалачан і знаёмства з іх мастацкай самадзейнасцю, экскурсіі на нафтаперапрацоўчы завод і хімічны камбінат зрабілі семінар куды больш змястоўным, чым гэта маглі б зрабіць адны толькі творчыя дыскусіі...

МЫ ЕХАЛІ ў Наваполацк па ледзь аснежанай Міншчыне і спыніліся ля Кургана-славы, каб ускласці вянок у гонар тых, што змагаліся за наш сённяшні дзень... Мы ехалі па легендарнай Лагойшчыне і зрабілі прыпынак у Хатыні, каб ускласці вянок у гонар надзвычайнай мужнасці і нескаронасці народнай... Пад'язджаючы да Наваполацка, убачылі, як з вечаровай цемры вырвалася зарыва агнёў вялікага горада. Кожны з нас не мог не прыгадаць: усё гэта сплочана крывёю герояў-партызан. У падмурку нашага беларускага гіганта Вялікай хіміі—не толькі воля і майстэрства будаўнікоў і інжынераў, але і мужнасць і самаадданасць змагароў за Радзіму ў гады найвялікшых выпрабаванняў ваеннай навалы...

Наваполацк сустрэў хлебам-соллю. І па ўсім было відаць, што семінар—падзея не толькі для яго ўдзельнікаў, але і для навапалачан. Не выпадкова большасць мерапрыемстваў семінара праводзілася з удзелам жыхароў маладога горада.

Як велічную паэму ў прозе слухалі ўдзельнікі семінара натхнёны расказ пра Наваполацк сакратара гарадскога камітэта партыі А. Бязлюдава. Ужо сёння Полацкі нафтаперапрацоўчы ўвайшоў у пяцёрку буйнейшых у свеце. Тут перапрацоўваюцца літаральна астранамічныя лічбы тон нафты. А юбілейны ленінскі год будзе адзначан новымі дасягненнямі, якія яшчэ больш уздымуць удзельную вагу завода і хімічнага камбіната сярод прадпрыемстваў нашай краіны. Калі навапалачане завяршалі адзін з адказных аб'ектаў на заводзе, заакіянскія «галасы» прарочылі няўдачу. Сёння гэтыя «прароцтвы» ў Наваполацку прыгадваюць са смехам. У горадзе вядзецца вялікае будаўніцтва — жытло, школы, дзіцячыя ўстановы, тэхнікумы, палацы культуры, ствараюцца стадыён, плавальны басейн. Тут, у Наваполацку, вельмі многа дзяцей, вельмі многа маладых сем'яў. Па рэгістрацыі шлюбаў і нованароджаных горад займае ледзь не самае першае месца ў краіне.

Пра ўсё гэта міжволі думалася, калі мы з цудоўнага прафілакторыя нафтавікоў, у якім жылі, ішлі на заняткі семінара ў прыгожы Палац нафтавікоў па галоўнай магістралі горада міма сціплага помніка, што на месцы першай наваполацкай палаткі... Гэта ж толькі падумаць: якіх-небудзь дзесяць гадоў назад на месцы гэтага ва ўсіх сэнсах сучаснага горада стаяла адна толькі палатка «дэсанту» будаўнікоў—сямёра камуністаў распалілі вогнішча, якое сёння палае на месцы колішняга балота мільёнамі агнёў.

ПРАГРАМА семінара была вельмі напружанай. Вось, напрыклад, як прайшоў дзень музыкі і тэатра. Ён пачаўся ў Наваполацкім музычным вучылішчы, навучэнцы якога сустрэлі гасцей хлебам-соллю, гарачымі прывітаннямі. Музыказнаўца Б. Смольскі расказаў пра творы беларускіх кампазітараў, прысвечаныя 100-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. А пасля са сцэны прагучалі новыя творы кампазітарскай моладзі. Іх каменціравалі музыказнаўца А. Ракава і самі аўтары. І. Лучанок, напрыклад, шмат папрацаваў у апошні час. Яго творчай справаздачай на семінары былі ўжо вядомая песня «Чырвоныя зоры» і прысвечаныя ленінскай тэме новыя песні—«Хадакі», «Апасіяната». Гэта творы патрыятычнага гучання, падказаныя кампазітару жыццём, рамантыкай барацьбы савецкага чалавека за здзяйсненне ленінскіх ідэй. «Заўсёды з Леніным» —так называецца новая кантата К. Цесакова. Яна прадыктавана пачуццямі глыбокай любові да Ільіча. У ёй знайшлі ўвасабленне тэмы ўсенароднага смутку з прычыны страты любімага правадыра, веры ў здзяйсненне ленінскіх ідэалаў, перакананне ў тым, што Ленін «сярод жывых ідзе жывы». Пасля гучалі новыя творы С. Картэса і іншых удзельнікаў семінара—маладых кампазітараў, прысвечаныя нашай сучаснасці. І ўсіх прысутных у зале ўсхваляваў натхнёны расказ кіраўніка Дзяржаўнага народнага аркестра БССР народнага артыста СССР І. Жыновіча аб сваіх творчых пошуках і аб творчасці сваіх калег, аб непарыўнай сувязі савецкага музычнага мастацтва з жыццём народа...

А працягваўся дзень музыкі і тэатра ў Палацы нафтавікоў. Аб тым, як лепш увасобіць вобраз Уладзіміра Ільіча Леніна на тэатральных падмостках і на экране, з глыбокім хваляваннем, натхнёна гаварылі намеснік старшыні праўлення Беларускага тэатральнага аб'яднання У. Стэльмах, рэжысёр тэатра імя Янкі Купалы В. Раеўскі, народны артыст БССР Ф. Шмакаў, галоўны рэжысёр тэатра імя Якуба Коласа С. Казіміроўскі і многія іншыя. Удзельнікі творчай дыскусіі адзінадушна пагадзіліся, што ў любой галіне мастацтва ленінская тэма патрабуе ад мастака надзвычайнай патрабавальнасці да сябе, высокай грамадзянскай адказнасці, сапраўднага натхнення.

ДЗЕНЬ ЛІТАРАТУРЫ па праграме быў апошні. Але дыскусіі па літаратурных пытаннях узніклі значна раней — у самым пачатку семінара, калі змястоўную размову пра сучаснасць і задачы творчай моладзі пачалі маскоўскія літаратары В. Кожынаў і А. Міхайлаў. Сваімі думкамі аб тым, як літаратура павінна служыць народу, дзяліліся не толькі маладыя пісьменнікі, але і маладыя рэжысёры, мастакі, артысты, архітэктары.

На семінары прагучалі новыя вершы маладых паэтаў Жэні Янішчыц, Людмілы Ганчаровай, Галіны Каржанеўскай, Юрася Касцюка, Мікалая Копанева, Леаніда Дайнекі, у тым ліку і навапалачан Валерыя Старынскага, Алеся Шпыркова, Уладзіміра Сіманенкі і іншых. У размове пра вершы маладых паэтаў прынялі ўдзел пісьменнікі І. Назуменка і А. Лойка, крытык У. Гніламёдаў, многія ўдзельнікі семінара і яго госці. Агульнапрызнана, што моладзь, якая сёння ідзе ў літаратуру, у большасці мае добрую філалагічную падрыхтоўку. Многія маладыя паэты маюць што сказаць чытачу. І ўсё ж, як гэта пераканаўча паказаў у сваім выступленні паэт А. Лойка, прааналізаваўшы больш дзесятка кніг паэзіі пачаткоўцаў, ім яшчэ бракуе высокай паэтычнай культуры, дасканалага валодання паэтычным словам. Бывае, нярэдка, вобразы-штампы вандруюць з кнігі ў кнігу, з верша ў верш. Сказанае не азначае, быццам у маладых паэтаў няма творчых дасягненняў. Яны ёсць. І пра іх гаварылася на семінары. Гэта перш за ўсё імкненне гаварыць пра хвалюючае ў сённяшнім жыцці народа і ў яго слаўным, гераічным мінулым. Гэта шчырасць лірычнай споведзі перад чытачом. Гэта імкненне знайсці свайго героя, унутраны свет якога тысячамі ніцей звязаны з нашай сучаснасцю. Але зусім зразумела, што ў ходзе спрэчак аб маладой паэзіі ў цэнтры ўвагі апынуліся недахопы, якіх трэба пазбегнуць. І можна спадзявацца, што таварыская крытыка у адрас паэтычнай моладзі, якая прагучала на семінары, пойдзе ёй толькі на карысць, прымусіць па-новаму паглядзець і на свае здабыткі, і на свае страты.

[Заканчэнне на 2-й стар.]

ГІСТОРЫЯ АДНОЙ ФАТАГРАФІІ

Іх было шаснаццаць. Шаснаццаць чалавек з розных куткоў Віцебшчыны, што праводзілі ў апошні шлях Ільіча. Зноў і зноў гляджу на гэту групавую фатаграфію, углядаюся ў твары людзей, такіх розных па ўзросце, і стараюся ўявіць сабе жыццёвыя дарогі, якія прайшоў кожны з іх.

Доўгі, доўгі час было толькі вядома, што на гэтай фотакартцы, якая знаходзіцца ў Віцебскім народным музеі У. І. Леніна, людзі, якія прадстаўлялі працоўных Віцебшчыны на пахаванні правадыра ў Маскве. Ні прозвішчы, ні пасады іх не былі вядомы.

Я тады працаваў у музеі і кожны раз, праводзячы чарговую экскурсію, падоўгу затрымліваў наведвальнікаў перад гэтай карткай, затрымліваў у тайнай надзеі, што хто-небудзь пазнае гэтых людзей. Але дарэмна.

Нэлі Мікалаеўне Дубоўскай, якая змяніла мяне на пасадзе экскурсавода, пашанцавала больш. Аднойчы ў час экскурсіі школьнікаў, васьмігадовая Верачка Крутарожкіна, зірнуўшы на фатаграфію, сказала сяброўцы, што там яе дзядуля. Размову пачула Нэлі Мікалаеўна і пачала распытваць дзяўчынку. Так стала вядома, што адзін з тых, хто зняты на фатакартцы, — Піліп Пятровіч Багданаў, які жыве ў Віцебску.

Калі мне перадалі гэта, адразу ж накіраваўся па адрасе.

Вось і вуліца «Праўды», дом пад нумарам 17. Стукаю ў дзверы. Выходзіць жанчына невысокага росту. Пытаюся таварыша Багданава.

— Яго няма, — адказвае жанчына. — Ён на рабоце.

— На рабоце? — вырываецца ў мяне. — А хіба ён не на пенсіі?

— Ах, вы пытаецеся старэйшага Багданава?

— Так, так.

— На жаль, ён два тыдні назад памёр.

З размовы выявілася, што перада мной стаіць жонка сына Піліпа Пятровіча.

— У яго ёсць і дачка, — гаворыць жанчына.— Яна жыве непадалёку.

Іду туды. Сяджу ў невялікім, цесна абстаўленым пакоі Дзіны Піліпаўны і Уладзіміра Рыгоравіча Крутарожкіных. Гасцінныя гаспадары паказваюць фатаграфіі Піліпа Пятровіча, граматы, якімі ён быў узнагароджаны за шматгадовую і бездакорную работу на Віцебскім чыгуначным вузле. А працаваў ён тут — 56 гадоў, з 1903 па 1959 гады. У рабочых П. П. Багданаў карыстаўся вялікай павагай і аўтарытэтам. Яго любілі за сумленнасць, сціпласць, прастату. Калі 45 гадоў назад, на жалобным мітынгу рабочых чыгуначнага вузла сталі вырашаць, каго паслаць сваім прадстаўніком на пахаванне Леніна, дзвюх думак не было—Багданава.

— Тата часта расказваў пра паездку ў Маскву, — гаворыць Дзіна Піліпаўна.— Многія падзеі нават апошніх гадоў у яго не засталіся ў памяці, але гэта паездка запомнілася назаўсёды. Іх было 16 чалавек, 16 дэлегатаў ад Віцебскай губерні. Яны ўсе сабраліся ў Віцебску, а потым паехалі ў Маскву. Там іх сустрэлі на вакзале, уладкавалі ў гасцініцу. З сабой віцябляне прывезлі вянкі, якія потым усклалі да труны правадыра. Адзін з гэтых вянкоў цяпер захоўваецца ў Кіеўскім філіяле Цэнтральнага музея У. І. Леніна. На чорнай стужцы яго надпіс: «Дарагому настаўніку, правадыру і кіраўніку рабочага класа Уладзіміру Ільічу Леніну ад прафарганізацый Віцебскай губерні».

У ганаровай варце ля труны У. І. Леніна ў Калоннай зале Дома Саюзаў з дэлегацыі Віцебскай губерні стаяла толькі тры чалавекі. У іх ліку і мой бацька. Да вайны ў нашай сям'і захоўвалася некалькі фатаграфій, якія атрымаў бацька, як удзельнік пахавання Уладзіміра Ільіча. Сярод іх была і групавая фатаграфія, фатаграфія Піліпа Пятровіча ля труны Леніна, пахавальная працэсія, ускладанне вянкоў. На жаль, усе гэтыя фатаграфіі загінулі ў час вайны.

— А як захавалася групавая фатаграфія дэлегатаў?

— Гэтым мы абавязаны віцебскаму журналісту Міхаілу Корневу,—адказвае Дзіна Піліпаўна.—Гэта ён знайшоў тату і падарыў яму фатаграфію. Як расказваў бацька, піянеры Шумілінскай школы ў час работы на прышкольным участку ў 1960 годзе адкапалі невялікую металічную скрынку, у якой сярод розных дакументаў была і гэта фатаграфія. Нейкім чынам яна трапіла да М. Корнева, якому ўдалося знайсці майго бацьку. Вось усё, што мне вядома. Паспрабуйце з'ездзіць у Шуміліна.

Еду ў Шуміліна. Калі фатаграфія была знойдзена там, значыць там жыве або жыў хто-небудзь з удзельнікаў паездкі.

На жаль, гэта паездка нічога не дала. У школе аб знаходцы фатаграфіі ў 1960 годзе нічога не чулі, а саму фатаграфію бачылі ўпершыню. Значыць тое, аб чым расказваў Піліп Пятровіч, было не ў Шумілінскай школе, а недзе ў іншым месцы. Але дзе?

Вярнуўшыся ў Віцебск, я зноў трывожу сям'ю Крутарожкіных. Прашу Дзіну Піліпаўну і Уладзіміра Рыгоравіча ўспомніць, можа Піліп Пятровіч называў прозвішчы астатніх дэлегатаў ад Віцебскай губерні.

— На жаль, не,—адказваюць абодва.—Мы часта пыталіся аб гэтым. Тата расказваў, што ўсе яны былі малазнаёмыя адзін з адным. Да таго ж, настолькі забіты горам, што было не да знаёмства. Праўда, тата запомніў, што ў другім радзе трэці справа сядзіць селянін з Гарадоцкага павета. Прозвішча яго ён забыў, але ў памяці выразна захавалася такая невялікая падрабязнасць: гэтага старога жартам усе называлі «Карлам Марксам» за яго пышную бараду і вусы. Больш нічога Піліп Пятровіч не расказваў.

Для пошукаў застаўся яшчэ адзін шлях — журналіст М. Корнеў. Званю ў радыёкамітэт. Адказваюць, што такі там не працуе. Куды выехаў, таксама не ведаюць. Даводзіцца займацца адначасова і пошукамі Міхаіла Корнева. Пакуль без вынікаў.

Я дасылаю гэтую фотакартку ў «Літаратуру і мастацтва» з надзеяй—мо на гэты раз пашанцуе, мо раптам хто-небудзь з чытачоў газеты знойдзе сярод гэтых шаснаццаці сваіх сваякоў ці знаёмых.

Вельмі ж хочацца даведацца пра землякоў, якім народ даручыў праводзіць у апошні шлях вялікага правадыра працоўных Уладзіміра Ільіча Леніна, даведацца пра іх далейшы лёс.

А. ПАДЛІПСКІ.

Вось яны, тыя шаснаццаць. П. Багданаў у трэцім радзе пасярэдзіне.

НАШЫ МАЙСТРЫ МАСТАЦТВА

...І ШТОДЗЁННАЯ ПРАЦА

Анатолю ШЭЛЕГУ — 60 ГАДОЎ

ШТО Ж, надыходзяць тыя гадавіны маіх сяброў, калі нам даецца права гаварыць адзін аднаму: «Памятаеш?..» З аддаленасці гадоў тое, што помніцца, можна разглядзець больш пільна, адкідваючы другараднае і выпадковае. У жыцці артыста гэта—яго ролі, вобразы, створаныя ім, знаходкі і, вядома, амаль непазбежныя ў тэатральным жыцці розныя цікавыя здарэнні, часам смешныя, а часам і вельмі сумныя.

Так, я памятаю многае з яго творчага жыцця. Шчыра кажучы, доўгі час ён мне здаваўся артыстам з тых, пра каго кажуць, што ён «зорак з неба не хапае». Гэта трохі парадаксальна — амаль з першых крокаў на сцэне Анатоль Шэлег пачаў іграць галоўныя ролі. Каб пацвердзіць, што я і сапраўды многае памятаю, скажу, што, напрыклад, яшчэ студыйцам Другога БДТ (цяпер тэатра імя Я. Коласа) малады акцёр выступаў у ролі Пеці ў «Цудоўным сплаве» Ул. Кіршона. Разам з ім дэбютавалі тады Т. Заранок, А. Трус і С. Хацкевіч, і гэта была вельмі светлая, я сказаў бы, сонечная камедыя. Сярод маладых герояў спектакля звяртаў на сябе ўвагу шэлегаўскі — ён быў і гарэзлівы, і кемлівы, і па-рабочаму адкрыты сябра.

Потым памятаю яго Ніла ў горкаўскіх «Мяшчанах», у спектаклі, які амаль адначасова з «Апошнімі» на сцэне Першага БДТ пачынаў мастацкае даследванне драматургіі вялікага пісьменніка на беларускай сцэне. Зноў роля — не апошняя, а, паводле сутнасці адлюстраваных у драме канфліктаў, завостранасці палітычных выказванняў, мабыць, першая. Цяпер я ўспамінаю гэтага Ніла як рабочага чалавека: не, гэта не быў пераапрануты артыст-гараджанін, а сапраўдны машыніст. Калі ён выходзіў на сцэну, здавалася, што на яго твары яшчэ гарыць сустрэчнае сонца, а валасы адкідвае вецер далёкіх маршрутаў. І гаварыў ён пераканана і горача...

Сказаўшы гэтыя словы — «пераканана» і «горача», мушу спыніцца на сваіх цяперашніх уяўленнях пра тыя, трыццацігадовай даўнасці спектаклі. Час накладвае на іх свой адбітак, і гэта зразумела. Шэлегаўскага Ніла, канечне, нельга параўноўваць з Нілам, якога паказвае ў пастаноўцы Г. Таўстаногава Кірыл Лаўроў. І справа тут не толькі і не столькі ў акцёрах, колькі ў атмасферы часу. Тады А. Шэлег падкрэсліваў публіцыстычны напал выказванняў героя, не баючыся нават таго, што мы называем рытарычнасцю. І гэта трэба было апраўдаць жыццёвым напаўненнем кожнага эмацыянальнага кроку і кожнага дзейснага ўчынку.

Затое колькі непасрэднасці было ў ім, калі ён выходзіў у «Лесе» А. Астроўскага Буланавым. Юны альфонс, яго персанаж быў на дзіва арганічны ў сваёй дурноце і нейкіх дзівосных здагадках аб тым, чаго ад яго чакаюць гаспадары жыцця (зразумела, перш-наперш Гурмыжская)! Гэтую ролю ў славутым тады мейерхольдаўскім «Лесе» іграў Іван Ныр'еў — завострана-гратэскава, амаль карыкатурна, як гэта і прадугледжвалася агульнай задумай эксперыментальнага спектакля. На фоне такога Буланава шэлегаўскі герой выглядаў больш традыцыйна, але выклікаў давер сваёй праўдай паводзін ва ўсіх гледачоў.

Вяртаюся да таго, аб чым сказаў вышэй — чаму ж тады ў мяне засталося ўражанне, быццам Анатоль Шэлег тых «зорак не хапаў»? Можа гэта ад майго асабістага знаёмства з ім — чалавекам па-за сцэнай зусім сціплым, падкрэслена «не акцёрам». Але, мабыць, такое ўражанне было памылковым. Відаць, усё ж не спыняўся ў Анатолю той працэс артыстычнага ўзбагачэння, без якога нельга ў мастацтве здабываць творчыя вяршыні (не абавязкова Манбланы!). Збоку паглядзіш — нічога асаблівага ў такой манеры жыцця ў тэатры і няма: яму далі ролю, ён яе сыграў, ну, можа, паспрачаўся трошкі з рэжысёрам, але і паслухаўся яго, а там пашукаў грым, нешта адкінуў, штосьці замацаваў... Дык жа так робіць кожны!

Вядома, кожны. Але ў тым, як настойліва і паслядоўна шукаў Анатоль Шэлег артыстычных кантактаў з настаўнікамі і паплечнікамі больш моцнага гарту — з Аляксандрам Ільінскім і Паўлам Малчанавым, Цімохам Сяргейчыкам і Мікалаем Звездачотавым, людзей багатых вопытам, як прагна слухаў ён рэжысёраў, калі яны працавалі і не з ім самім, а з удзельнікамі спектакля, у якім у Шэлега не было прыкметнай ролі, — ва ўсім гэтым было н а к а п л е н н е майстэрства. Мабыць, наогул, у тэатры асноўны працэс станаўлення акцёра-мастака адбываецца ў віры чарговых работ партнёраў і калег, ва ўзаемным уздзеянні таварышаў, аб'яднаных агульнай любоўю да справы, якой яны служаць, і да таго тэатра, дзе яны служаць.

Служаць — гэта, мабыць, не тое слова. Коласаўцы жывуць тэатрам у роднай садружнасці. Садружнасці, якая не выключае, а наадварот, прадугледжвае шчырую прынцыповасць ва ўсім, што датычыць творчасці. Тут яны не ведаюць кампрамісаў, хоць, зразумела, могуць часам і памыляцца, калі раптам трупу захопіць зробленае, а гэта зробленае імі яны лічаць бездакорным. Мінае час, ацэнкі ўсталёўваюцца, і тэатр цвяроза асэнсоўвае пастаўленыя спектаклі і сыграныя ролі.

Зноў спашлюся на памяць. Памятаю Анатоля Шэлега Паратавым у «Беспасажніцы», дзе так ярка раскрыўся талент Раісы Кашэльнікавай у ролі Ларысы Агудалавай. Побач з гераінай быў прыгожы чалавек, мужчына, як мае быць, з тых, хто спакусіць любую... Ён трохі рэзаніраваў, трохі дэманстраваў свае «свецкія» манеры, рабіў выгляд высакароднага ў думках і ўчынках «льва». Атрымлівалася халаднавата, адчуваўся рацыянальны падыход акцёра да кожнага з «прыстасаванняў», адрэпеціраваных ім. Яго называлі Паратавым, аднак на сцэне не было самога Паратава. У тэатры аб гэтым пазбягалі гаварыць, аберагалі акцёра ад крыўды. Анатоль здагадваўся, што да поспеху ён не дабраўся. І як бы збіраў волю, каб у наступнай ролі ўзяць рэванш...

Рэванш, калі толькі так можна гаварыць пра поспехі артыста, ён браў тады, калі іграў больш блізкіх яго індывідуальнасці людзей. Калісьці яму ўдалося наблізіцца да буйнага характару ў вобразе Гадуна («Разлом» Б. Лаўранёва), які яму давялося ствараць пасля безумоўнага поспеху ў гэтай ролі Кастуся Саннікава. У гады вайны ён быў строгім і тэмпераментным генералам Агнёвым у карнейчукоўскім «Фронце», матросам Рыбаковым у «Крамлёўскіх курантах»...

Ёсць у біяграфіі Анатоля Шэлега, умоўна кажучы, і выбухі ці, назавем гэта інакш, адхіленні ад традыцыйнага амплуа «станоўчага» (на тэатральным лексіконе гэта яшчэ называецца «сацыяльнага») героя. Асабліва яркім было такое адхіленне ў «Гамлеце» Шэкспіра, дзе Валерый Бебутаў даручыў яму іграць Лаэрта. Калі я цяпер перабіраю свае тагачасныя ўражанні, мне здаецца, што гэты юнак з Эльсінорскага замка часам выступаў празмерна падкрэсленай антытэзай Гамлету, якім яго іграў Павел Малчанаў. Добра гэта ці не — цяжка сцвярджаць праз дваццаць з лішкам гадоў. Памятаю, што тады я адчуваў, што такі зацяты ў сваіх «так» і «не» Лаэрт, які прэцца напралом нават там, дзе варта было б папярэдне і падумаць, быў неабходнай падтрымкай тэмпераменту і інтэлектуальным шуканням прынца Дацкага. Да таго ж яшчэ А. Шэлег дзеля кантрасту, са згоды рэжысёра, бываў на дзіва пяшчотным у сцэнах з бацькам Палоніем — Ільінскім і сястрой Афеліяй — Бялінскай. Гэтыя хвіліны душэўнай далікатнасці як бы разбуралі стэрэатып таго Лаэрта, якім ён хацеў і прымушаў сябе быць у барацьбе за месца пад сонцам Эльсінора.

Або яшчэ адхіленне ад паважнай «станоўчасці» ў рэпертуары Анатоля Шэлега — поштмейстар Шпекін у гогалеўскім «Рэвізоры». Прызначэнне акцёра на гэтую ролю было нечакана для ўсіх. Таксама і тое, што Паўлу Малчанаву рэжысёр Навум Лойтэр даручыў быць... Бобчынскім. Характэрныя персанажы набывалі сцэнічнае жыццё ў «Рэвізоры» на беларускай сцэне ў выкананні артыстаў з рэпутацыяй герояў. І ад гэтых выканаўцаў патрабавалася, каб яны ўмелі натуральна жыць у самых неверагодных для іх ранейшых персанажаў абставінах. Больш таго — хоць ты дагэтуль амаль што і не меў задач насмяшыць публіку, цяпер табе дазвалялася і гэта. Але — як? Без штучнага камікавання, у ансамблі з такім выдатным майстрам смешнага, як Аляксандр Ільінскі, што быў тады Іванам Аляксандравічам Хлестаковым з Пецярбурга! І атрымалася нешта дзівоснае — шэлегаўскі поштмейстар выглядаў правінцыяльнай копіяй сталічнай «штучкі»: гэта ж і ў яго таксама няма цара ў галаве, а засталося толькі адно жаданне «усё» ведаць і пра «ўсё» разносіць звесткі па горадзе. Такое ўражанне з'яўлялася амаль з першай рэплікі Шпекіна, якую надзвычай натуральна для характару і вельмі смешна вымаўляў прыдуркаваты і дасціпны чыноўнік: «Ах так... Тады, значыцца, не будзе вайны з туркамі...» Канечне, салістам у «Рэвізоры» у добрым сэнсе гатага слова выступаў А. Ільінскі, але сярод яго дуэтных сцэн сцэна са Шпекіным была адной з самых бліскучых.

Самае цікавае, што гэтыя, як іх я называю, адхіленні памагалі Анатолю Шэлегу рабіць больш маляўнічымі і свае традыцыйныя персанажы, нават юнакоў-палюбоўнікаў, якімі выглядалі ў яго выкананні і Юрась з «Несцеркі», і Шата з «Алазанскай даліны».

Здаецца, і я пачынаю пералічваць ролі з вялізнага спісу сыграных Анатолем Шэлегам на коласаўскай сцэне. Абмяжую сябе тым, што назаву некаторыя этапныя працы артыста— у драматычнай паэме «Святло з Усходу» П. Глебкі ён сыграў Аляксандра Мяснікова, у камедыі «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы — Туміловіча, у драме «Раскіданае гняздо» Я. Купалы — Сымона, у горкаўскіх «Ворагах»—Мікалая Скробатава, а ў «Зыкавых» — Анціпа Зыкава, у легендзе «Машэка» В. Вольскага — Машэку, у інсцэніраванай А. Звонакам трылогіі «На ростанях» Я. Коласа («Навальніца будзе») —Варанкевіча, у кампазіцыі па рамане «Сэрца на далоні» І. Шамякіна — Антона Яраша, у шэкспіраўскім «Каралі Ліры» — графа Кента, у драме «Шостае ліпеня» М. Шатрова — наркома Чычэрына... Не ведаю, пра якія з іх Анатоль Рыгоравіч Шэлег будзе ў гэтыя дні ўспамінаць сам, як пра тыя, што застаюцца з акцёрам на ўсё яго жыццё, нават і тады, калі пасля прэм'еры мінаюць гады і дзесяцігоддзі. Ёсць такія — артыст усё яшчэ адчувае іх характар, іх гарачае дыханне, біццё іх сэрца. Здаецца, хай толькі скажуць, што заўтра ты зноў павінен выйсці на сцэну, скажам, тым жа Нілам — табе, мабыць, і тэкст паўтараць не прыйдзецца. Прынамсі, аднойчы Анатоль прызнаўся ў гэтым. І такому творчаму самаадчуванню мастака можна толькі пазайздросціць — гэта азначае, што шлях у жыцці быў абраны не выпадкова, што сцэна і сапраўды стала тваім прызваннем і тваім духоўным клопатам.

Акцёр можа здагадвацца і часам нават добра ўсведамляць, што яго ў гэтай ролі спасцігла няўдача або наадварот, што кожны выхад на сцэну ў гэтай ролі для яго свята. І ўсё роўна афіша будзе клікаць акцёра на працу, як фабрычны гудок. — І акцёр, карыстаючыся ўрокамі Станіслаўскага, абудзіць у сабе творчае самаадчуванне, каб быць на сцэне тым, каго яму належыць сёння паказваць. Што ні дзень, то і дзень нараджэння сцэнічнага вобраза, і гэта — як у паэта: «Я не лічыў бы салдатам сябе, каб не гатоў быў прайсці праз няўдачы. Я не лічыў бы аратым сябе, каб першы град мог скасіць маю веру ў калоссі. І не лічыў бы паэтам сябе, каб кожны мой дзень не быў днём нараджэння...» Анатоль Шэлег мае права паўтарыць такія радкі, замяніўшы ў іх словы «салдат» і «араты» і «паэт» словам «артыст». Такое права ён заваяваў і самаахвярнай штодзённай працай, і здольнасцю пераўтварыць кожны будзённы дзень творчасці ў дзень мастацкага адкрыцця ў чалавеку чалавека. Адкрыцця, якое адбываецца пад прыцэлам бязлітасных пражэктараў рампы. На працягу ўсёй сцэнічнай дзейнасці гэтага акцёра яго духоўнай спадарожніцай была і застаецца вера, што ён абавязаны па загадзе сэрца рабіць тое, што яму даручана тэатрам: ён умее прымусіць сябе палюбіць і нелюбімую ролю. А гэта — рыса высокага прафесіяналізма!

Усё часцей яму даручаюць ролі характарныя. У такіх выпадках кажуць, што акцёр змяняе вахту, пераходзіць на новы пост у мастацтве. Гэта заканамерна. І добра, што Анатоль Шэлег радуе гледачоў і на гэтай — не менш пачэснай сваёй артыстычнай пасадзе. Радуе, бо па-творчаму шукае і знаходзіць сутнасць і характарнасць сваіх герояў у логіцы іх паводзін, у грамадзянскай пазіцыі таго персанажа, якога ён сёння ўвечары паказвае са сцэны. Ён іграе з добрым пачуццём локця калег, падпарадкоўвае сябе агульнай кіруючай задуме спектакля. Радуе і тым, як ставіцца да сваіх мастацкіх абавязкаў — трэба выйсці ў эпізодзе, калі ласка, ён старанна загрыміруецца, дасканала вывучыць тыя рэплікі, што дадзены яму аўтарам, зойме сваё сціплае месца сярод тых, каму сёння выпадае несці на сваіх плячах асноўны рэпертуар і іграць у коласаўскім калектыве ролі, якія так і называюцца тут «шэлегаўскімі».

Называючы сыграныя А. Шэлегам ролі, я склаў як бы свой задзіяк з больш-менш яркіх асабіста для мяне сузор'яў, бо ў гэтых ролях бачыў і помню артыста. Хтосьці другі складзе такі задзіяк з іншых сузор'яў. Даробак артыста немалы: з чаго выбіраць ёсць. Яго рэпертуарны спіс сыграных ролей неад'емна ўпісаны ў акцёрскі летапіс станаўлення беларускага савецкага тэатральнага мастацтва.

Ён выслухае многа шчырых прывітальных слоў у дзень свайго нараджэння. Ведаю, што будзе і адмахвацца ад празмерна ўрачыстых маналогаў. Адмахвацца з той лагоднай ўсмешкай, якая і для мяне вельмі дарагая, бо яна — ад сэрца і сапраўды, па перакананні і па ўсім вопыце с ц і п л а г а п р а ц а ў н і к а беларускай сцэны. Мабыць, мы будзем спрачацца з ім і гаварыць, што няма чаго яму занадта ўжо саромецца, калі побач з яго імем ставяць узнёслыя эпітэты. Бо калі азірнуцца на тое, што помніцца з яго артыстычнай біяграфіі, а потым памножыць колькасць рэпетыцый і спектакляў на эмоцыі, што не паддаюцца ніякаму ўліку, дык не будзе перабольшаннем назваць Анатоля Шэлега, народнага артыста Беларускай ССР, камуніста, добрага сябра моладзі, грамадскага дзеяча і ўдумлівага мастака, в о л а т а м. Так, ён з волатаў нашага роднага тэатральнага мастацтва, і за гэта яму пашана і слава ад імя шматлікіх прыхільнікаў яго таленту.

Аркадзь МАЎЗОН.

ЛЕНІНСКАМУ ЮБІЛЕЮ— ТВОРЧАСЦЬ МАЛАДЫХ

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

Для прадстаўнікоў усіх творчых цэхаў быў цікавы грунтоўны даклад І. Навуменкі аб праблемах сучаснай беларускай прозы, аб месцы пісьменніка ў жыцці краіны і народа, аб здабытках маладых празаікаў, аб задачах, якія ім прадстаіць рашыць. У абмеркаванні гэтага даклада ўдзельнікі семінара прымалі актыўны ўдзел.

Дзень літаратуры быў адзначаны двума значнымі сустрэчамі маладых пісьменнікаў і іх старэйшых калег з чытачамі. У Наваполацкай кнігарні прадаваліся кнігі ўдзельнікаў семінара і гасцей. Чытачы атрымалі сотні аўтографаў. А затым у Палацы нафтавікоў адбыўся вялікі вечар паэзіі. Гучалі патрыятычныя вершы аб радзіме і партыі, аб героях-пагранічніках і аб Наваполацку, аб каханні і працы, аб родным Леніне. Хораша настрой гэтага дня і гэтых сустрэч з чытачамі можна выказаць словамі паэта Валянціна Лукшы з яго новага верша «Непахіснасць», прысвечанага Ільічу: «Наша Заўтра, Любоў і Вера, як Ільічовы думкі, як поўня, поўныя!» Пачуццём гэтым былі прасякнуты ўсе дні семінара.

СУР'ЁЗНА І ДЗЕЛАВІТА абмяркаваны пытанні творчасці маладых мастакоў у дзень выяўленчага мастацтва і архітэктуры. Удзельнікі дыскусіі і ўсе ўдзельнікі семінара пазнаёміліся з невялікай выстаўкай, якую прывезлі з сабой маладыя мастакі. Экспанаваліся творы А. Пятрухны, В. Лук'янава, А. і Г. Чысцяковых, В. Матросава, А. Пуцейкі, Г. Мазурава і іншых. Скажу адразу: выстаўка атрымалася не вельмі цікавай. Яна складзена была з выпадковых работ, якія захапілі з сабой на семінар маладыя мастакі. Але ўсё ж экспазіцыя паказала і станоўчыя і адмоўныя тэндэнцыі ў творчасці маладых мастакоў.

І на выстаўцы, і ў часе дыскусіі аб выяўленчым мастацтве міжволі думалася: калі ў аснову сваёй творчасці малады мастак пакладзе надзённыя думкі, глыбокія пачуцці, ён адразу адчуе, што для іх увасаблення вельмі мала прыдатныя (а можа і зусім непрыдатныя) тыя эпігонскія формы, у якія сёння нярэдка заключаюцца няспелыя, вузка асабістыя (калі не сказаць — суб'ектывісцкія) думкі і пачуцці.

Бывае, маладыя мастакі схільныя прымаць за рэалістычныя тыя ці іншыя з мадэрнісцкіх прыёмаў, якія трапляюць у поле іх зроку з розных крыніц інфармацыі. Некрытычнае скарыстанне арсеналу мадэрнісцкай фарматворчасці—вынік пагоні за модай або пошуку «лёгкіх шляхоў» да поспеху. І на гэта неабходна звярнуць пільную ўвагу таму, што эпігонства, перайманне модных у мадэрнісцкім мастацтве павеваў у галіне формы незаўважна прыводзіць і да значных страт у галіне зместу. Так з'яўляюцца творы з невыразнай задумай, з анемічнымі або наўмысна агрубленымі «героямі». А ад такіх «твораў» адзін крок да безыдэйшчыны, скажэння рэчаіснасці, да такога роду «рэалізму», берагі якога размываюцца.

Жывая практыка савецкага мастацтва сведчыць, што метад сацыялістычнага рэалізму дае шырокую прастору развіццю разнастайных творчых індывідуальнасцей як у галіне зместу, так і ў галіне формы. Але мы мусім ні на хвіліну не забываць, што жывое рэчышча рэалізму не можа быць зусім пазбаўлена берагоў, як гэта ўяўляе сабе, напрыклад, Ражэ Гарадзі. Вывады гэтага даследчыка эстэтыкі рэалізму — хоча ён таго ці не хоча — груба скажаюць метадалагічныя прынцыпы рэалістычнага мастацтва.

Пра неабходнасць для маладых мастакоў асабліва клапаціцца аб партыйнасці і народнасці сваіх твораў, аб выразнай і правільнай класавай пазіцыі, аб адзінстве зместу і рэалістычнай формы гаварылі ў сваіх выступленнях на семінары заслужаны дзеяч мастацтваў БССР М. Гуціеў, мастацтвазнаўца А. Рожын (Масква), мастак Я. Красоўскі і іншыя.

У ходзе дыскусіі было падкрэслена, што час, які мы перажываем, і жывая практыка сучаснага мастацтва (не толькі выяўленчага) сведчаць, што сапраўдныя творчыя перамогі чакаюць мастака на шляху рэалізму. Малады мастак павінен больш смела ставіць перад сабой змястоўныя творчыя задачы — быць песняром душэўнай прыгажосці савецкага чалавека, велічы яго здзяйсненняў. Пастаноўка перад сабой такіх высакародных задач несумненна прывядзе да неабходнасці больш патрабавальна паставіцца і да саміх выяўленчых сродкаў, да творчага почырку. Малады мастак пераканаецца, што сацыялістычныя ідэі магчыма перадаць масам гледачоў менавіта ў багацці і разнастайнасці рэалістычных форм.

КІРУНАК дыскусіі аб архітэктуры быў прадвызначаны, мабыць, тым, што на пачатку мы паслухалі даклад аб помніках беларускага дойлідства. Доктар архітэктуры У. Чантурыя змястоўна расказаў аб шляхах станаўлення беларускай архітэктуры. Таму натуральна, што гаворка зайшла перш за ўсё аб сінтэзе старога і новага ў архітэктурным абліччы нашых гарадоў, аб захаванні помнікаў архітэктуры. А вельмі многім удзельнікам семінара хацелася б пагаварыць з маладымі дойлідамі аб іх творчасці, аб іх праектах, здзяйсненнях, аб новых творчых задумах. Мабыць, на наступным семінары трэба прыняць захады, каб забяспечыць і архітэктарам, і мастакам магчымасць прывезці свае планшэты, мадэлі, вялікія карціны, а можа быць нават і мадэлі скульптур.

У значна лепшым становішчы былі кінематаграфісты. Яны прывезлі свае фільмы—«Штрыхі да партрэта», «Беларусь мая сінявокая», «Я, Францыск Скарына...». Першыя дзве з названых стужак выклікалі ажыўлены абмен думкамі, а на трэцюю, на жаль, не хапіла часу, паколькі яна была паказана ў канцы дня. А на наступны дзень чакалі чарговыя мерапрыемствы.

ВЕЛЬМІ важна падкрэсліць, што маладыя прадстаўнікі ўсіх творчых саюзаў атрымалі на семінары шырокую і ўсебаковую інфармацыю аб падрыхтоўцы розных мастацкіх калектываў да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. І ў гэтым плане цікавымі былі гутаркі на семінары, якія правялі намеснік міністра культуры БССР А. Ваніцкі, старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі Б. Паўлёнак, намеснік старшыні праўлення Беларускага тэатральнага аб'яднання У. Стэльмах, народны артыст СССР І. Жыновіч і музыказнаўца Б. Смольскі, пісьменнік І. Навуменка, дырэктар студыі «Беларусьфільм» У. Іваноўскі.

Надзённыя праблемы, якія стаяць перад маладой творчай інтэлігенцыяй рэспублікі, падкрэсліў у сваім выступленні на семінары загадчык сектара мастацкай літаратуры аддзела культуры ЦК КПБ пісьменнік А. Савіцкі. Праблемам камуністычнага выхавання моладзі прысвяціў сваё выступленне сакратар ЦК ЛКСМ Беларусі Г. Анціпаў.

ВОСЕМ дзён працягваўся гэты форум творчай моладзі рэспублікі. Ён прынёс вялікую карысць усім, хто ў ім удзельнічаў.

Няма сумнення, што той ідэйна-творчы зарад, які атрымалі ўдзельнікі семінара, выкліча да жыцця новыя творы, прысвечаныя нашай сучаснасці, прасякнутыя наступальнай, рэвалюцыйнай сілай уздзеяння. Наша маладая творчая інтэлігенцыя, якая імкнецца несці на сваім сцягу партыйнасць і народнасць, у абстаноўцы небывала абвостранай ідэалагічнай барацьбы старога і новага светаў зойме яшчэ больш актыўныя пазіцыі ў сцвярджэнні ідэй Камуністычнай партыі. Дарэмна актывізуе свае дзеянні варожы нам лагер. Ніякія правакацыі і паклёпы ворагаў не заблытаюць нашу творчую моладзь, якую выхоўваюць партыя і камсамол, якую выхоўвае наш народ.

З такім адчуваннем ехалі мы з Наваполацка. З такім адчуваннем глядзелі наперад, вяртаючыся да штодзённых спраў. З такім адчуваннем гаварылі пра новыя творчыя задумы і кампазітары, і мастакі, і паэты. Так, напрыклад, жывапісец Валодзя Матросаў сказаў:

— Абавязкова прыеду ў Наваполацк у творчую камандзіроўку. Бо столькі задум узнікла!.. А галоўнае, прыйшло яснае ўсведамленне — трэба больш вывучаць жыццё, больш пісаць на натуры... Такія цудоўныя людзі тут і ў калгасе, што ў Новых Гаранах, і ў самім Наваполацку... Так і просяцца ў палотны!..

А рэжысёр з Гродна Уладзімір Унукаў быццам падхоплівае ягоную думку:

— Сустрэчы! Знаёмствы! Нам трэба штодзённа імкнуцца падтрымліваць творчыя кантакты з прадстаўнікамі ўсіх творчых цэхаў!.. Семінар моцна падштурхнуў творчую думку.

— Ніколі не забуду велічныя ўстаноўкі нафтаперагоннага завода, яны клічуць прыехаць да сябе яшчэ і яшчэ, — гаворыць мастак Аляксей Пятрухна. — Уражанняў столькі, што коратка не скажаш. Па-мойму, лепшым расказам будуць нашы творы, прысвечаныя людзям, якія ўвасабляюць у жыццё ідэі Леніна...

А вось водгук салісткі тэатра оперы і балета Веры Садоўскай:

— Я ўпершыню прымала ўдзел у рабоце такога семінара. Мяне захапіла яго творчая атмасфера. Ах, як не хацелася расставацца з новымі сябрамі! Кожны, па-мойму, вяртаўся з семінара з думкай: пабольш бы такіх сустрэч нашым творчым работнікам! А цяпер — за працу...

Так, цяпер — за працу. Семінар скончыўся. І ў той жа час семінар працягваецца — ён у тым роздуме, якім кожны з яго ўдзельнікаў ахоплены цяпер, ён у тых задумах, якія кожным з нас будуць здзейснены.

Ул. БОЙКА,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

З пошты ЛіМа

«ПАДЛІКОВЕЦ» ЦІ «ЛІЧЫЛЬНІК»?

Пра нашу літаратурную мову з поўным правам мы гаворым сёння як пра сфармаваную, сталую. Тым не менш працэс актыўнага узбагачэння яе слоўнікавага складу — як за кошт багацця народнай лексікі, фразеалогіі, сінтаксісу, так і ў выніку стварэння новых слоў, увядзенне ва ўжытак неабходных запазычанняў — увесь час няспынны.

Тут мне рупіць пагаварыць пра словы, якія ў пярэдадзень і ў сам перыяд правядзення Усесаюзнага перапісу насельніцтва, становяцца вельмі пашыранымі. «Перапіс праводзіцца шляхам апытання насельніцтва спецыяльна падрыхтаванымі *лічыльнікамі...*» («Звязда», 1958, 17 мая.) Толькі з кантэксту мы можам даведацца, што ў дадзеным выпадку гаворка ідзе не пра прыборы для вымярэння колькасці выпрацаванай электраэнергіі.

Аднойчы на камсамольскім сходзе пачалі выбіраць «лічыльнікаў» для падліку галасоў, і ў мяне само сабой прыдумалася слова *падліковец*. Яно, бадай, не патрабуе падрабязнага тлумачэння. Падліковец нешта *падлічвае*, робіць той ці іншы *падлік*.

Зараз, як і ў часе папярэдняга перапісу, мы настойліва праз друк і радыё прапагандуем яшчэ адно, на маю думку, не зусім дакладнае словазлучэнне. Ім называюць своеасаблівы штаб перапісу, установу, што займаецца арганізацыяй і правядзеннем гэтай дзяржаўнай справы, альбо пэўную тэрыторыю, на якой працуе падліковец.

«На працягу васьмі дзён *лічыльшчык* павінен закончыць работу на *сваім лічыльным участку*». («Вячэрні Мінск», 1969, 31 кастрычніка). Лічыльшчык, лічыльны ўчастак... Відаць, натуральней і прыгажэй, больш зразумела для чытачоў загучаў бы гэты сказ, калі б на іх месца сталі словы «падліковец», «падліковы ўчастак».

Заўважу між іншым, што поруч з «падлікоўцам», правы на існаванне можа мець і яго пабрацім — слова «ўліковец» (ад *улічваць* што-небудзь). Ім можна называць, напрыклад, памочніка калгаснага ці саўгаснага брыгадзіра — «учотчыка».

«Руска-беларускі слоўнік» да рускага слова «счетчик» прыводзіць два эквіваленты: «лічыльшчык» — калі размова ідзе пра чалавека, і «лічыльнік» — калі маецца на ўвазе які-небудзь прыбор. Відавочна, слоўнікавае гняздо трэба некалькі ўдакладніць. Слова «лічыльнік» у значэнні тэхнічнай прылады мэтазгодна захаваць. Калі ж мы гаворым пра чалавека, які займаецца пэўным падлікам, дык тут дарэчы, здаецца мне, ужываць слова «падліковец».

В. РАГОЙША,
кандыдат філалагічных навук.

ЧЫТАЧЫ ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ

□ Грамадскасць Кобрына адзначыла 15-годдзе мясцовай музычнай школы. За гэты час тут падрыхтавана каля трохсот музыкантаў.

Зараз на дзённым і вячэрнім аддзяленнях школы па класах баяна, акардэона, скрыпкі, домры, фартэпіяна займаецца каля 400 чалавек.

Д. АХРЫМУК.

□ У цэнтральнай кнігарні Шклова абсталяваны спецыяльны стэнд — «Паэты Магілёўшчыны». Пакупнікі тут могуць набыць зборнікі вершаў сваіх паэтаў-землякоў — Аляксея Пысіна, Васіля Матэвушава, Анатоля Сербантовіча, Яўгена Крупенькі і іншых ураджэнцаў Магілёўшчыны.

А. ШАРАЕЎ.

Пятро Фёдаравіч ГЛЕБКА

РАССТАННЕ

Расстанне...

Так раптоўна, у тую самую пару, калі вясна пакрысе, па хвіліне вызваляе дзень ад зімовага змроку.

І ты, сапраўды, не прыдзеш у гэтую вясну?

Гавару, пытаюся, усё яшчэ не даючы веры.

Пятро Фёдаравіч Глебка...

Гэта — у жалобнай рамцы на газетнай паласе. А ў душы — Пятро! Мілы, мілы дружа!

І руцэ не пад сілу вывесці — памёр, сканаў, адыйшоў ад нас...

Мы не разлучаліся ад таго часу, як сустрэліся падлеткамі. Сорак пяць год. Цэлае жыццё. Пасябравала навучанне, а пасля — вершы.

Слухай, дарагі дружа! Ці не ўчора мы сядзелі поруч на студэнцкай лаўцы? Жылі акно ў акно — цераз вуліцу, аддавалі апошняга стыпендыяцкага паўрубля, каб паслухаць Маякоўскага?

Тады ты, цяперашні акадэмік, паэт чыстага голасу і добрай вядомасці, падпісваў першыя радкі для дзяцей — «Піянер Глебка». А пазней, босы, пяшэчкам, уброд цераз Нёман, дабіраўся з мае хаціны пад Слуцкам да сябе, на Уздзеншчыну. Ці ж не ўчора? Зусім нядаўна ты з усмешкай гаварыў пра ўсё гэта перад нашымі агульнымі сябрамі.

Сорак пяць свядомых, вядомых у кожным кроку год правёў Пятро Глебка ў безупынным стварэнні: роднага ладу, роднай літаратуры і навукі.

Гэта высакародная праца ўсім вядома, усімі ацэнена і прызнана. Не цяжка адказаць — чаму. Усё, за што б ні браўся ён, рабіў з вялікім запасам трываласці, надзейна, на многія гады. Аддаючы справе ўвесь талент, усю сілу чалавека, усё сумленне грамадзяніна.

Навука і літаратура не раз яшчэ са скрухай уздыхнуць над старонкамі, якія не паспела дапісаць рука выдатнага паэта і вучонага. А тое, што сабрана ў кнігах, — вершы, паэмы, п'есы, — намоцна прынята ў чалавечыя сэрцы.

Яго творы — вельмі натуральныя, нязмушаныя, простыя. Таму так блізкія народу — вобраз Сяргі Арджанікідзе і падобны на палявога васілька хлапчук у вакзальным тлуме, і малады партызан, які прынёс землякам цераз лінію фронту акраец чорнага хлеба. Роднага, які абавязвае перамагчы.

Каб хоць нагадаць пра ўсё, што ён зрабіў, якую павагу заслужыў ад людзей за сваю працу і жыццё, за выключную ўвагу да нас усіх, трэба час, каб падужэць сэрцам. Такая гадзіна абавязкова прыдзе. Скажацца, напішацца аб ім достойна, як таго заслужыў Пятро Глебка.

А сёння ў дні сумнага развітання мы нізка кланяемся табе, добры працаўнік беларускай зямлі, дарагі чалавек са светлым розумам вучонага і гарачым сэрцам паэта.

Максім ЛУЖАНІН.

ЧАЛАВЕК, ПАЭТ, ГРАМАДЗЯНІН

Некалькі год назад, ездзячы па рэспубліцы, мы з Пятром Глебкам спыніліся ў адной вёсцы, пачалі гутарыць з селянамі пра жыццё іх, працу, пра справы ў калгасе. Праз дзесяць мінут размовы адзін з слухачоў, не ведаючы з кім гаворыць, сказаў пра Пятра Фёдаравіча: «Во гэта чалавек! Адразу відаць — ад зямлі».

Я часта ўспамінаў гэтыя словы пры жыцці Пятра Фёдаравіча, калі ў разных жыццёвых сітуацыях, у розных паездках, пры рашэнні пытанняў малых і вялікіх у нашым Саюзе хацелася паўтарыць: «Во гэта чалавек!».

Я ўспомніў словы сяляніна сёння, калі мы ў жалобе стаім над свежай магілай, рыхлая зямля засыпала знаёмае роднае аблічча таго, хто шчырасцю і сардэчнасцю сваёй, розумам, талентам, працай заслужыў права на самыя высокія, самыя ганаровыя званні: Чалавек, Паэт, Грамадзянін. Родных, блізкіх, сяброў яго, шматлікіх сяброў-пісьменнікаў, чытачоў можа судзешць у вялікім горы адно: з намі, жывымі, засталіся творы Пятра Глебкі, паэзія яго, і ў іх жыве сам творца, усе рысы яго душэўнага вобліка, надзвычайная чуласць сэрца, шырыня натуры, глыбіня і празрыстасць думкі. Можна бясконца гаварыць аб стылі глебкавага мыслення, аб глыбіні яго выказванняў. Але мне хочацца ў гадзіны смутку яшчэ і яшчэ раз нагадаць аб яго надзвычайнай легендарнай чалавечай абаяльнасці.

Пятро Фёдаравіч быў чалавек, як усе мы — з нервамі, з эмоцыямі. Але хто калі чуў, каб ён злаваўся ў грубым сэнсе гэтага слова — крычаў, прабіраў падначаленых ці даказваў правату не эрудыцыяй сваёй у адкрытай спрэчцы, а становішчам сваім? Не, не было гэтага ніколі. Пятро Фёдаравіч ні перад кім не паказваў сваю перавагу. У яго знаходзілася мноства аргументаў, каб спакойна, разважліва, не спяшаючыся пераканаць любога апанента. Мы, яго сябры, якія многа з ім хадзілі і ездзілі па свеце, траплялі ў розныя сітуацыі, маглі б прыбесці безліч прыкладаў, як Пятро Фёдаравіч мог пераканаць, улагодзіць самага ўпартага ці ўзлаванага чалавека. І як тонка ён адчуваў настрой людзей, іх душэўныя рухі! Не аднойчы я назіраў, як шафёр таксі, які садзіў нас у машыну, здавалася, злуючыся на ўвесь свет, праз пяць хвілін весела закурваў са старэйшым пасажырам — Пятром Фёдаравічам і выказваў яму усе свае крыўды і нягоды. Гэтае ж я назіраў пры размовах Пятра Фёдаравіча з праваднікамі, афіцыянтамі, служачымі гасцініц і проста з суседзямі. Між іншым, такому збліжэнню з рознымі людзьмі вельмі памагала яшчэ адна выдатнейшая рыса цудоўнага чалавека і паэта — яго дэмакратычнасць, народнасць у спалучэнні з высокай інтэлігентнасцю, далікатнасцю.

Таму і мы, маладзейшыя яго калегі па літаратуры і навуцы, так цягнуліся да гэтага абаяльнага чалавека.

Я на пятнаццаць гадоў маладзейшы за Пятра Фёдаравіча і ўступіў у літаратуру як празаік. Але вельмі хутка пасля майго ўключэння ў актыўнае жыццё пісьменніцкай арганізацыі мы пасябравалі. Я з гонарам вымаўляю і пішу гэтае слова — пасябравалі. Лічу за шчасце, што лёс надараваў мне такога сябра, у якога было чаму павучыцца. Мы многа разам ездзілі — па Беларусі, у Літву, на Украіну, у Маскву, у Ленінград, у Таджыкістан, Грузію, жылі ў адной гасцініцы, часта ў адным нумары, і кожная такая паездка, кожная гутарка з Пятром Фёдаравічам (а некаторыя з гэтых гутарак, разумных, дасціпных, вясёлых, працягваліся да раніцы, асабліва калі прысутнічалі іншыя сябры) узбагачала мяне, як добрая кніга.

Сёння над магілай, усланай вянкамі і кветкамі, схіляю ў жалобе сваю ўжо таксама пасівелую галаву і кажу: «Шчырае табе дзякуй, дарагі Пятро Фёдаравіч, за тваю дружбу, за чуласць, за навуку.

Бывай дружа і настаўнік!

Няхай імя тваё будзе сімвалам той дабраты і шчырасці, да якой прыйдуць усе людзі».

Іван ШАМЯКІН.

БЫВАЙ, ДРУЖА!

Хвароба — парок сэрца—не была для Пятра навіною. «Мяне,— казаў ён,— некалі і ў армію праз яе не прызвалі. А я з гэтаю хваробаю, дзякаваць, не дрэнна ладжу ўжо дзесяткі гадоў. Можа яна адступіцца і на гэты раз». Тыдні два перад тым Пятро кінуў курыць. І ўсё дзівіўся і радаваўся, што можна жыць і без курыва: «Як быццам нанава чалавек на свет нарадзіўся».

Ды не адступілася старая праклятая хвароба... Няўмольная смерць вырвала з нашых радоў таго, хто дзесяткі год кожнаму з нас быў блізкім і дарагім. Для мяне ж гэтая ўтрата асабліва цяжкая і балючая. Мы з Пятром не толькі землякі — уздзенцы, а і аднакашнікі з першых крокаў у навуку, пачынаючы з дзіцячых гадоў. Тыя, ўжо далёкія гады, і раднілі нас, і выводзілі на шырокую дарогу жыцця.

Як я радаваўся, калі праз нейкі час услед за мною прыехаў у Белпедтэхнікум і Пятро. І не менш радаваўся кожнаму яго вершу для «Беларускага піянера», дзе я працаваў, бо ўжо тыя першыя вершы маладога паэта Пятра Глебкі мелі ў сабе ўсе адзнакі сапраўднай паэзіі. Стаўшы вядомым паэтам, Пятро не забываў юнага чытача. Вершы яго для дзяцей ўжо даўно сталі хрэстаматыйнымі, лепшымі ўзорамі для маладых паэтаў.

Эх, Пятро, Пятро! Не садзіць табе болей кветак на роднай зямлі, не цешыцца імі... На векі вечныя перастала біцца тваё добрае сэрца, закрыліся твае спагадлівыя да людзей вочы.

Бывай, дарагі сябра!

Алесь ЯКІМОВІЧ.

ЯГО ЛЮБІЎ КОЛАС

ЯШЧЭ зусім нядаўна мы бачылі яго. Ён стаяў у гурце сваіх сяброў і ўважліва слухаў прамовы на адкрыцці мемарыяльнай дошкі ў гонар працы народнага паэта Беларусі Якуба Коласа на пасадзе віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук рэспублікі. А пасля, калі закончыўся мітынг, вакол яго тоўпіліся маладыя сябры-паэты. Па-ранейшаму іскрыліся ягоныя вочы, свяцілася лагодай твар.

Праз нейкі час пачулі—Пятро Фёдаравіч занядужаў. І раптам — жудасная вестка: яго не стала... «Няўжо ён больш да нас не прыйдзе, не павядзе задушэўную гаворку пра Якуба Коласа з залаў музея для нашых тэлегледачоў?» Такія гутаркі паспелі стаць традыцыйнымі, і «тамадой» іх адзінадушна быў абраны Пятро Фёдаравіч Глебка.

Блізкі сябра і паплечнік Якуба Коласа, ён многа мог сказаць пра народнага песняра. І рабіў гэта па-свойму, па-глебкаўску цёпла, проста і шчыра. На апошнюю сустрэчу з таварышамі ён прыйсці не змог. Усе гэта разумелі і спадзяваліся, што наступную перадачу павядзе зноў Пятро Фёдаравіч...

Любіў яго Якуб Колас. Прысвячаў яму свае вершы. Яны вялі шматгадовую сяброўскую перапіску. Доўга паэты ішлі побач і рабілі вялікую справу—развівалі нашу літаратуру, нашу культуру, нашу навуку. Не стала Якуба Коласа, Пятро Фёдаравіч шмат сіл і турбот аддаў ушанаванню памяці свайго старэйшага таварыша.

Ён заўсёды быў блізкі да коласаўскага дома. І мы ўсе даражылі гэтай дружбай.

Д. МІЦКЕВІЧ, дырэктар Літаратурнага музея Якуба Коласа, М. БАЗАРЭВІЧ, І. КУРБЕКА, М. ПРАТАСЕВІЧ, А. СЛЕСАРЭНКА, навуковыя супрацоўнікі музея.

РАЗВІТАЛЬНАЕ СЛОВА

НЕСПАДЗЯВАНА сумная вестка дайшла да ўсіх нас. Перастала біцца чулае сэрца цудоўнага натхнёнага паэта, драматурга, палымянага барацьбіта за мір, вядомага вучонага, літаратурнага крытыка і дапытлівага даследчыка роднай беларускай мовы і фальклору.

Паэзія Пятра Глебкі надзычай музычная, пявучая. На яго вершы з ахвотаю пісалі рамансы, дуэты, хоры беларускія кампазітары Мікалай Аладаў, Уладзімір Алоўнікаў, Анатоль Багатыроў, Пётр Падкавыраў. Менавіта для Мікалая Ільіча Аладава Пятро Глебка напісаў лібрэта да яго оперы «Андрэй Касценя», якое з'явілася, на маю думку, адным з лепшых у беларускай опернай драматургіі. Па сваёй дакладнасці, дасціпнасці і высокай літаратурнай якасці гэты твор нагадвае гістарычныя эпапеі «Святло з Усходу» і «Над Бярозай-ракой», напісаныя ім для драматычнай сцэны.

Уся паэтычная, навуковая і грамадская работа Пятра Фёдаравіча сведчыць аб яго выдатных рысах паэта-грамадзяніна, чулага і спагадлівага чалавека, сапраўднага гуманіста, які заўсёды быў гатовы прыйсці на дапамогу свайму сябру ў любых абставінах.

Я. ЦІКОЦКІ,
народны артыст СССР.

■

МЫ выбралі сабе розныя дарогі ў жыцці — ён літаратар, я — хімік. Але так здарылася, што мы доўгія гады працавалі поруч. Пра гэтыя гады я буду заўсёды ўспамінаць з удзячнасцю.

Пятро Фёдаравіч заўсёды адзіўляў нас сваім талентам, высокай культурай, энцыклапедычнымі ведамі, душэўнасцю.

Асабліва падружыліся мы з ім у час сумеснай работы ў прэзідыуме Акадэміі навук. Заўсёды ветлівы, добразычлівы, уважлівы, ён быў душой нашага калектыву. Мы ўсе ведалі: калі што-небудзь будзе даручана Пятру Фёдаравіну, можна быць упэўненым — гэта будзе зроблена выдатна, з бляскам.

Апошнія гады Пятро Фёдаравіч працаваў акадэмікам-сакратаром аддзялення грамадскіх навук Акадэміі навук БССР. На гэтай пасадзе, вельмі адказнай, ён заўсёды праводзіў лінію нашай партыі з уласцівай яму палымянасцю, любоўю і адданасцю.

Памяць пра Пятра Фёдаравіча Глебку назаўсёды застанецца ў сэрцах вучоных Беларусі.

М. ЯРМОЛЕНКА,
акадэмік Акадэміі навук БССР.

■

ПАМЁР наш дарагі і сардэчны таварыш... Памёр выдатны паэт і вучоны, адзін з асноваположнікаў беларускай савецкай літаратуры. Не стала песняра—сардэчнага друга і настаўніка літаратурнай моладзі. Дачасна адышоў ад нас чалавек, які быў так патрэбны нашай культуры і навуцы.

Глыбокім болем адбілася ў сэрцы кожнага з нас смерць выдатнага чалавека, паэта, вучонага, грамадзяніна.

Бывай, наш дарагі друг і настаўнік.

Вечны спакой табе.

Вечная слава табе за ўсё тое добрае, што зрабіў ты для свайго народа, для роднага краю.

Сцяпан МАЯХРОВІЧ.

НЕЗАБЫЎНАЕ, НЕЗАБЫЎНЫ...

КОЛАСАЎЦЫ ў жалобе — Пятро Глебка для нас не толькі імя выдатнага мастака і грамадскага дзеяча, а імя вельмі блізкага і сталага сябра нашага тэатра. Здаецца, ён стаў ім з першых нашых сустрэч. Яго можна было пабачыць з артыстамі ў шчырай размове аб тым, як той іграў сёння ўвечары, у спрэчцы аб тым, як вымаўляецца слова на Уздзеншчыне, адкуль Пятро Фёдаравіч паходзіць, і ў нашых мясцінах, на Віцебшчыне, і як яго тады трэба вымаўляць на сцэне. Калі гаворка датычыла драматургіі, дык ён здзіўляў нас як сапраўдны эрудыраваны знаўца гэтай галіны мастацтва літаральна ўсіх часоў і народаў. І, канечне, яму былі знаёмы самыя рэдкія старонкі развіцця беларускага тэатральнага мастацтва — тут яго можна было слухаць гадзінамі. Мабыць, з гэтых нашых гутарак і пачалося тое, што мы звычайна называем супрацоўніцтвам паміж тэатрам і аўтарам: Пятро Глебка напісаў для Другога БДТ гераічную драму «Над Бярозай-ракой», пералік дзеючых асоб у якой адкрываўся імем Сяргі Арджанікідзе, колішняга члена Рэўваенсавета 16-й арміі, што дзейнічала ў 1919 годзе на Барысаўшчыне. Здаецца, гэты наогул першы ў беларускай літаратуры вопыт стварэння вобраза выдатнага дзеяча Камуністычнай партыі, аднаго з правадыроў рэвалюцыі.

Зразумела, ўсе ў тэатры хваляваліся. Хваляваўся і аўтар, вядомы паэт, які з добрай сарамлівай усмешкай прызнаваўся, што дэбютанту ў драматургіі даводзіцца нібы пачынаць літаратурны шлях нанова.

Але ў часе застольных чытак і сцэнічных рэпетыцый Пятро Фёдаравіч не выглядаў навічком у тэатры. Яго парады нараджаліся не з імправізацый, а зыходзілі з глыбокага ведання гістарычнага матэрыялу і спецыфікі жанру, абранага для ўвасаблення задумы. Ён захапляў выканаўцаў і рэжысуру сваім раматычным бачаннем падзей нядаўняга мінулага. Мы і цяпер яшчэ чуем яго не зусім «вакальны» голас, калі ён напяваў для нас задуменна і ўзрушана:

Над Бярозай-ракой, над
далінаю
Заігралі гарністы паход.
Узнімайся сям'я сакаліная,
Уставай на змаганне, народ!..

Спектакль быў прасякнуты вялікім тэмпераментам, які дыктаваўся зместам драмы і тымі паэтычнымі ўзлётамі, што так шчодра раскрываў Пятро Глебка і ў напружана-драматычных эпізодах, і ў жанравых сцэнах. Яго і самога захапляла маляўнічасць напісанай ім жа рыначнай мітусні ў трэцім акце драмы. І сапраўды, колькі трапных назіранняў і сакавітых рэплік ў ёй, якое веданне народнага побыту! Мы ледзь стрымлівалі сябе, каб не зарагатаць, чуючы, скажам, такія словы: «Купляйце, панове, на косы бруські, за сем загатовак — чатыры кускі. Ільга і касу і язык падвастрыць, лягчэй будзе з жонкай тады гаварыць...» Адчуванне народнага аптымізму, жывога гумару і трапнага слова пералілося ў драму і давала артыстам багацейшы матэрыял для стварэння і асноўных, і так званых другарадных вобразаў. Пасля твораў Якуба Коласа, сыграных у нашым тэатры, гэта былі новыя ўрокі вялікай драматургіі на прыкладзе п'есы ў вершах.

Потым мы доўга чакалі наступнай сустрэчы з Глебкам-драматургам. Не было ніводнага яго візіту ў Віцебск, каб паэт не пабываў у нашай акцёрскай сям'і. Зноў — гутаркі, абмеркаванні, спрэчкі. Нас радавала тое, што Пятро Фёдаравіч ведае акцёраў Другога БДТ, сочыць за іх творчасцю, што ён — патрабавальны сябра, які ўмее тактоўна падказаць нешта вельмі важнае, параіць... А мы да яго з адным пытаннем: «Калі новая п'еса будзе?»

І ён перадаў яе зноў нашаму калектыву. І на гэты раз твор прысвячаўся рэвалюцыйным падзеям.

Калектыў аддаваў пастаноўцы «Святла з Усходу» самыя натхнёныя гадзіны працы. Аўтар паглыбіўся ў працэс стварэння спектакля, ён быў з намі, як першы знаўца таго, што трэба паказаць на сцэне. Жанравыя асаблівасці пастаноўкі вызначаў характар драмы — гераічная эпапея. Зноў мы сустрэліся з драмай, напісанай вершам. Зноў артыстам і рэжысуры давялося браць новыя вяршыні ў творчасці. І гэта захапляла.

Відаць, далёка не ўсё атрымлівалася ў нас дасканала. Але тыя вялікія творчыя задачы, якія прапаноўваў нам Пятро Глебка, пашыралі рэпертуарныя гарызонты тэатра, мабілізавалі акцёрскую тэхніку і вымагалі дадатковай самаадукацыі, паглыблення ў жыццёвую сутнасць адлюстраваных паэтам-драматургам падзей і вобразаў. Гэта пакідае яркі след у жыцці артыстычнага калектыву. Гэта застаецца незабыўным.

Шчодрасць яго душы была і ў тым, як зацікаўлена ён ставіўся да любой новай работы нашага тэатра. Зусім нядаўна Пятро Фёдаравіч быў нашым субяседнікам, прагледзеўшы такі адназны спектакль, як «Шостае ліпеня». Яму хацелася выглядаць строгім, але мы бачылі: яго нешта ўсхвалявала. І ён не стрымаўся і сказаў, што цяпер, з цягам часу, пераконваецца, што вобраз Леніна на беларускай сцэне можа быць і сапраўды блыбокім, па-мастацку своеасаблівым, і гэта яму, паэту рэвалюцыйнай тэматыкі неяк асабліва дорага.

Коласаўцы — у жалобе. Мы нізка схіляем галовы над магілай Пятра Фёдаравіча Глебкі.

Мікалай ЗВЕЗДАЧОТАЎ,
Алена РАДЗЯЛОЎСКАЯ,
Цімох СЯРГЕЙЧЫК,
Анатоль ТРУС,
народныя артысты БССР.
Віцебск.

ШЧОДРАЕ СЭРЦА

Больш сарака гадоў я добра ведаў Пятра Фёдаравіча і заўсёды даляраў яму свае сардэчныя думы. І вось жахлівая вестка. Пагадзіцца з ёю ніяк не можа сэрца. Зусім нядаўна я наведаў яго ў бальнічным пакоі. Прыйшлі да яго радня, яго блізкія таварышы Максім Танк, Рыгор Бярозкін. Гутарка ішла не пра яго хваробу, а пра літаратуру. Максім Танк расказваў пра сваю паездку на юбілейныя пушкінскія дні ў Ленінград. Рыгор Бярозкін — пра свае творчыя планы. Сумна не было. Пятро Фёдаравіч не лічыў сябе хворым. Ён шмат успамінаў, цікавіўся, спрачаўся, даводзіў і пераконваў. А пасля клапаціўся аб тым, што і паэма яго яшчэ не закончана, а часопіс «Полымя» ўжо ўключыў у план і чакае рукапіс, што набліжаецца пленум Саюза пісьменнікаў і ён не зможа прыняць удзел. Адным словам, скардзіўся на тое, што «часу няма, а ён тут як паніч вылежваецца і ні пра што не дбае». Здавалася і нам, што ніякіх пагрозаў не прадбачыцца, і што Глебка прыйшоў сюды толькі для «часовага рамонту», як ён сам любіў жартаваць.

Спакойны і разважлівы аптымізм ніколі не пакідаў яго, у якія б цяжкія абставіны ні ставіў яго жыццёвы лёс... Прыпамінаюцца мне дваццатыя і трыццатыя гады—гады нашага літаратурнага юнацтва і ўсялякіх часовых літаратурных размежаванняў. Пятро Фёдаравіч заўсёды трымаўся таго жыццёвага кірунку, які не парушае таварыскасці і дружбы ў імкненні да стварэння глебы для росквіту нашай роднай літаратуры і культуры. Адмятаючы ўсё наносное і несправядлівае, ён заўсёды знаходзіў самае трывалае зерне, якому жыццё, праз доўгую чараду гадоў і падзей, прадракала багаты плён.

Часта і доўга мне даводзілася разам з Пятром Глебкам бываць у дарозе. Лепшага спадарожніка, як Глебка, нельга нават сабе ўявіць. Дарога збліжала і дапамагала раскрыць душу. Глебка ніколі не быў «папутчыкам», а быў сапраўдным спадарожнікам і другам. Ён быў беларускім паэтам, гарачым патрыётам нашай Савецкай Радзімы, верным сынам беларускага народа. Аб гэтым сведчыць уся яго творчасць і вялікая грамадская дзейнасць. Простым і чалавечным быў Глебка. Усім ён раскрываў свае шчодрае сэрца, з усімі любіў падзяліцца самымі запаветнымі сваімі думкамі. Не хочацца верыць, што сярод нас ужо няма Пятра Фёдаравіча Глебкі.

Мікола ХВЕДАРОВІЧ.

НЕ МАГУ ПАВЕРЫЦЬ...

Страта друга — ці можа быць страта больш горкая! Асабліва друга—спадарожніка ўсяго жыцця, з якім колісь юнаком выйшаў поруч на шырокую дарогу жыцця, плячо якога ўвесь час прывык адчуваць побач — і вось друга няма...

Пятро Фёдаравіч Глебка быў не толькі выдатным паэтам, не толькі драматургам, літаратуразнаўцам, лінгвістам — ён быў чалавекам шырока і глыбока адукаваным ва ўсіх відах мастацтва, чалавекам, які цудоўна і тонка адчуваў і разумеў жывапіс, скульптуру, архітэктуру, музыку. Нездарма ў ліку самых блізкіх сяброў яго былі мастакі і вучоныя, кампазітары і артысты.

Мяне заўсёды вабілі яго чалавечыя якасці — дабрата, чуласць, трапны і дасціпны гумар, радасць у выпадку сустрэчы з талентам, заклапочанасць, каб гэты талент дужэў.

Не веру—не магу паверыць —што ніколі больш яму не пазваню, не сустрэну, не запрашу да сябе ў майстэрню, не пачую яго разумнага слова, яго добразычлівых заўваг.

Заір АЗГУР,
народны мастак БССР.

ПАМЯЦІ НАСТАЎНІКА

Завейны снег...
Яшчэ ці ўчора
Вы нас, як рунь,
Прывецілі ў гуртку..
Мне можа ўтрая цяжэй сягоння
гора,
Што вы паціснулі яшчэ тады руку...

Трымаў і я
Той камячок свяшчэннай глебы
Каля прырэчнае Усы,
Што Вам у сны
Прыходзіў з пахам хлеба
І з хмельнай першароднасцю
красы.

І Вы жылі ў імя красы вялікай
Бядой і дабратой
І мудрасцю зямлі.
Асцерагалі нас, бывала,
Ад пралікаў,
А свайго сэрца —
не асцераглі...

Мікола АРОЧКА.

ДЗЯКУЙ ТАБЕ, МАЙСТАР!..

ГЭТАЯ вестка настолькі нечаканая, што не магу ніяк паверыць ёй: памёр Пятро Глебка.

Па-душэўнаму мне асабліва балюча: памёр не толькі выдатны майстар нашай паэзіі, агульнапрызнаны аўтарытэт літаратуры, памёр блізкі мне чалавек, з якім мы жылі ў добрым суседстве ў адным доме, на адной лесвічнай пляцоўцы — дзверы ў дзверы.

Цяжка паверыць, што яго ўжо няма. Усё яшчэ здаецца, што вось пачую яго спакойную ўпэўненую хаду, яго разважны добры голас, які я прывык чуць кожны дзень.

Ёсць людзі, са смерцю якіх ніяк не можаш змірыцца яшчэ і таму, што сама іх натура ніколі не мірыцца з нябытам, з канцом жыцця.

За многія гады, у якія я ведаў Пятра Фёдаравіча, пачынаючы з самага нялёгкага часу яго жыццёвай сталасці — у дні Вялікай Айчыннай вайны, і ў гады, калі набірала сілу новае пакаленне, і ў дні, калі паміж высокіх тытулаў — паэт, акадэмік — найбольш часцей ўсё ж гучала званне дзеда, якое павінна было напамінаць чалавеку пра цяжар узросту,— я ні разу не чуў, каб мой сусед калі паскардзіўся на тое, што яму няможацца, што яму не па сіле работа, якую ён любіць, якою жыве.

Да позняе ночы за сцяной — лёгкае пакашліванне, размераныя ціхія крокі.. Я ўжо ведаю — мой сусед працуе. Працуе тады, калі ўсе спяць, калі зацціхлі шумныя вуліцы Мінска. Такія часіны душэўнай сабранасці, роздуму сам-насам з сабою Пятро Глебка вельмі любіў і даражыў імі, хоць па сваім характары гэта быў нястомны, няўрымслівы завадатар самага актыўнага людскога таварыства. Там, дзе Глебка, там — вясёлая сябрына, там — шчырая і цікавая размова, размова аб літаратуры, аб паэзіі, аб жыцці, там — самыя вострыя, бескампрамісныя спрэчкі, хай сабе для некага і непрыемныя, але заўсёды справядлівыя. Пятро Фёдаравіч умеў сказаць праўду ў вочы свайму лепшаму сябру. І як бы табе гэта адразу ні здалося непрыемным, але ты ніколі не адчуваў крыўды, бо ведаў: чалавек, які ведае цану слову, не раскідаецца сваімі вынадзмі і ацэнкамі.

У цяжкія гады вайны, калі мы, нешматлікае асяроддзе беларускіх пісьменнікаў, па заніку нашай партыі і ўрада рыхтаваліся да горкай і шчаслівай сустрэчы з роднай зямлёй не з пустымі рукамі, а ў сілу магчымасцей і здольнасцей кожнага — з рэальнымі здабыткамі сваёй працы, Пятро Фёдаравіч быў адным з самых натхнёных стваральнікаў часопіса «Беларусь», потым нашага дзяржаўнага выдавецтва, якое пачынала сваё жыццё суровай зімой 1944 года ў Маскве, у Вялікім Чаркаскім завулку, у халодных, прамёрзлых наскрозь пакоях, дзе мы вымушаны былі пісаць алоўкамі, бо чарніла адразу ж замярзала. Адной з намнога кніг, якія выпусціла наша выдавецтва, было і маё «Гартаанне». Гэтая тоненькая, без вокладкі, на шарай кепскай паперы, мая першая кніжачка — дарагая мне таму, што выпраўляў яе ў жыццёвую дарогу Пятро Глебка, паэт, кожны верш якога ў тыя дні прызнаваўся намі, маладымі, за самы высокі ўзор паэзіі.

Сапраўды, у тыя гады, у гады вялікай суровай мужнасці, можа як ніколі праявіўся ва ўсёй сваёй сіле талент Пятра Глебкі, высокі талент паэта-філосафа. Кожны яго новы верш мы сустракалі як значную падзею нашага духоўнага жыцця. Такія шэдэўры глебкавай лірыкі, як «Вячэрнія думы», «Сны хлапчука», «Смерць салдата», «Пісьмо з няволі», «Пасылка», «Зварот», «Аб чым спяваюць салаўі», «Пад небам бацькаўшчыны», самі сабою завучваліся напамяць, станавіліся душэўным здабыткам кожнага, хто любіў і шанаваў роднае слова, аддаваў усе свае сілы на вызваленне Савецкай Радзімы.

Мінулі гады. Чытаеш і перачытваеш яго вершы, якія ўжо сталі нашай класікай, і сэрца поўніцца гордасцю, што напісаў іх чалавек, пра якога многія з нас з удзячнасцю гавораць: майстар, настаўнік.

Дарагі мой суседзе, разам з апошнім развітаннем я кажу табе — даруй, даруй за тое, што не ўмеў выказаць усяго гэтага табе, жывому...

Васіль ВІТКА.

ДЗВЕ СУСТРЭЧЫ

Цяжкая страта. Горкі сум агарнуў усіх, хто некалі сустракаўся і працаваў разам з ім яшчэ ў першыя гады станаўлення Савецкай улады, хто потым чытаў яго прасякнутыя любоўю да роднай зямлі вершы і паэмы, хто ў цяжкія гады выпрабаванняў для Радзімы сустракаўся з ім як з воінам-змагаром з фашысцкай навалай. Не стала нашага дарагога сябра і патрыёта зямлі Савецкай, руплівага даследчыка і знаўцы беларускай мовы, паэта і акадэміка, вядомага грамадскага дзеяча і дэпутата Вярхоўнага Савета БССР Пятра Глебкі.

У гэтыя цяжкія жалобныя дні мне прыгадваюцца дзве незабыўныя сустрэчы з Пятром Глебкам. Першая — зімою 1924—25 года, калі Пятро прыехаў вучыцца ў Мінскі белпедтэхнікум. Другая — праз 45 гадоў на партызанскай сустрэчы ў Руднянскіх лясах Лагойскага раёна.

Чым урэзалася ў памяць тая першая сустрэча ў рэдакцыі «Беларускай вёскі»? Чалавечымі турботамі 19-гадовага юнака пра вясковую беднату, яго камсамольскім запалам і непрымірымасцю да ўсяго таго, што перашкаджала будаваць новае жыццё, народжанае Савецкім ладам.

Ударлявы, апрануты ў жоўты паношаны нажушок, юнак з вёскі Вялікая Уса выцягваў аднекуль з глыбокай кішэні зашмальцаваны сшытачак і клаў яго на стол Кузьму Чорнаму:

— Напісаў у «Беларускую вёску» пра нашы непарадкі... Фельетон пра вясковых багацеяў-крывасмокаў...

Пад вершам-фельетонам стаяў подпіс: Г. Асот, а ўнізе — Пятро Глебка, студэнт Мінскага белпедтэхнікума.

Юнаку ішоў толькі дваццаты год, калі ў друку, у тым жа 1925 годзе, з'явіўся адзін з яго першых вершаў:

Горад, горад і родная вёска!
Адышлі дні пакут і прымусу,
Вы красуеце сёння ў
пялёстках
Дзіўнай кветкі жывой —
Беларусі.

З тае пары прайшло 45 гадоў. Не аднойчы мы сустракаліся ў родным Мінску, радаваліся росквіту беларускай літаратуры, гутарылі пра шчаслівы лёс многіх з тых, хто пачынаў прабаваць свае сілы ў маладой, народжанай Кастрычнікам беларускай журналістыцы.

Апошняя і незабыўная наша сустрэча адбылася зусім нядаўна, сёлетнім летам, у Руднянскіх лясах на Лагойшчыне. Актыўны ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны, патрыятычныя вершы якога шырока распаўсюджваліся ў варожым тыле, ён прыехаў на партызанскую сустрэчу. У прыгожым сасновым бары над разасланымі абрусамі Пятро падымаў кілішак за гераізм народных мсціўцаў. Ён прыгадваў цікавыя эпізоды з партызанскай вайны на Беларусі і ўсё наказваў:

— Хлопцы, трэба пісаць... У вас жа невычэрпная крыніца фактаў усенароднага подзвігу.

Пасля мітынгу мы хадзілі з ім па лесе, паказвалі руіны зямлянак былога падпольнага райкома партыі і раённай друкарні. На ўскраі лесу, дзе стаяў некалі партызанскі млын, Пятро ўглядаўся ў далёкі луг і сінія воды невялікай рачулкі. Радаваўся навакольнаму гоману людзей і спевам птушак. І з добрай чалавечай зайздрасцю гаварыў:

— У вас жа тут, браткі, зямны рай... Дзе яшчэ такую прыгажосць знойдзеш?! Восенню абавязкова ў грыбы прыеду...

Але не суджана было паэту яшчэ раз пабываць у гэтых дарагіх партызанскіх краях. Як шкада, што няўмольная смерць так рана падкасіла чалавека вялікай душы і патрыятызму, вернага сына Камуністычнай партыі і народа.

Алесь МАТУСЕВІЧ.

Пятро Фёдаравіч ГЛЕБКА

У АПОШНІ ШЛЯХ

Адышоў ад нас выдатны беларускі пісьменнік, акадэмік-сакратар аддзялення грамадскіх навук Акадэміі навук БССР, вядомы грамадскі дзеяч, дэпутат Вярхоўнага Савета Беларускай ССР Пятро Фёдаравіч Глебка.

Вялікая канферэнц-зала Акадэміі навук БССР, з якой на працягу 25 гадоў былі звязаны жыццё і праца П. Ф. Глебкі, у жалобе. На пастаменце — труна з целам нябожчыка. На падушачках — узнагароды, якімі Радзіма адзначыла працоўныя і ратныя подзвігі слаўнага сына беларускага народа — ордэн Леніна, два ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэны Чырвонай Зоркі, «Знак пашаны», медалі.

Вакол пастамента — мноства вянкоў: ад ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў БССР, ад прэзідыума Акадэміі навук Беларускай ССР, праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, ад партыйных, савецкіх, прафсаюзных, камсамольскіх і грамадскіх арганізацый, міністэрстваў і ведамстваў, навуковых і навучальных устаноў.

22 снежня адкрыўся доступ да цела нябожчыка. З 10 гадзін раніцы не спыняўся людскі паток.

У зале не змаўкаюць жалобныя мелодыі. Праз роўныя прамежкі часу мяняецца ганаровая варта. Жалобную вахту нясуць члены праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, члены прэзідыума Акадэміі навук БССР.

Надыходзяць апошнія мінуты развітання. У ганаровую варту становяцца таварышы Ц. Я. Кісялёў, У. Е. Лабанок, У. Ф. Міцкевіч, С. А. Пілатовіч, С. О. Прытыцкі, Ф. А. Сургалаў, намеснік старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР І. Ф. Клімаў, намеснікі старшыні Савета Міністраў БССР У. Г. Каменскі, Р. Я. Кісялёў, П. Л. Коханаў.

У 15 гадзін адбыўся жалобны мітынг. Яго адкрыў прэзідэнт Акадэміі навук БССР М. А. Барысевіч.

— Таварышы! Нас напаткала вялікае гора. Сёння мы праводзім у апошнюю дарогу старэйшага паэта Савецкай Беларусі, таленавітага вучонага і грамадскага дзеяча, адданага сына партыі і народа Пятра Фёдаравіча Глебку. Увесь яго жыццёвы шлях — гэта шлях чалавека, які выйшаў з народа і працаваў для дабра яго.

Пятро Фёдаравіч нарадзіўся 6 ліпеня 1905 года ў беднай сялянскай сям'і ў вёсцы Вялікая Уса, на Уздзеншчыне. Пераможны Кастрычнік адчыніў перад ім дзверы ў навуку, расхінуў шырокія далягляды жыцця. Разам з Янкам Купалам, Якубам Коласам, Міхасём Чаротам, Кандратам Крапівой і іншымі Пятро Фёдаравіч стаяў ля вытокаў беларускай савецкай паэзіі, што сёння складае гонар і славу нашага народа.

З 1944 года П. Ф. Глебка пераходзіць працаваць на навуковую ніву. Ён узначальвае групу мовазнаўцаў, якая рыхтавала «Руска-беларускі слоўнік». У 1950 годзе П. Ф. Глебка выбіраецца членам-карэспандэнтам АН БССР, а ў 1957 годзе — акадэмікам АН БССР. У гэты час П. Ф. Глебка ўзначаліў Інстытут мовазнаўства. Вялікую работу правёў па арганізацыі першай у рэспубліцы шматгаліновай гуманітарнай даследчай установы — Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. З пачатку заснавання (1957 год) інстытута акадэмік Глебка амаль да апошніх дзён свайго жыцця быў кіраўніком і душой калектыву.

Пятро Фёдаравіч як паўнамоцны прадстаўнік беларускага народа, яго навукі і культуры неаднаразова ўдзельнічаў у міжнародных форумах, у тым ліку ў рабоце Генеральнай Асамблеі ААН.

Як акадэмік-сакратар аддзялення грамадскіх навук П. Ф. Глебка надзвычай многа рабіў для накіроўвання навуковай работы ўсіх гуманітарных інстытутаў акадэміі на вырашэнне надзённых праблем навукі і культуры, якія вынікаюць з задач камуністычнага будаўніцтва.

Светлая памяць аб Пятру Фёдаравічу Глебку назаўсёды застанецца ў тых, хто меў шчасце з ім сустракацца і працаваць.

Слова атрымлівае першы сакратар праўлення саюза пісьменнікаў БССР, народны паэт рэспублікі Максім Танк.

— Дарагія таварышы! Сумная вестка аб раптоўнай смерці выдатнага беларускага паэта Пятра Фёдаравіча Глебкі, нашага старэйшага таварыша і друга, набатным гулам загрукала ў дзверы шматлікіх яго сяброў, чытачоў, сваякоў, уварвалася ў нашы сэрцы.

Яшчэ зусім нядаўна мы сустракаліся з ім, раіліся па розных творчых справах, бо ён быў чалавекам надзвычай шырокіх і грунтоўных ведаў, які ніколі не замыкаўся толькі ў літаратуры, хоць яна і была яго прызваннем.

Здаецца, нядаўна мы яго бачылі ў салдацкім шынялі на шляхах Заходняга і Паўночна-заходняга франтоў, на дарогах вайны, а яшчэ раней — на дарогах Заходняй Беларусі як удзельніка вызваленчага паходу ў незабыўныя вераснёўскія дні 1939 года.

Многія сябры памятаюць Пятра Фёдаравіча студэнтам, тым юнаком, які па закліку сэрца пачаў складаць свае першыя песні аб сваёй радзіме і рэвалюцыі, якая вывела наш народ на новы шлях— светлы шлях сацыялізма. Які кароткі век чалавека, калі мы толькі сёння сабраліся яму сказаць аб тым, як яго любім і шануем!

Пятро Фёдаравіч належаў да тых песняроў, якім першым выпала шчасце быць мабілізаванымі партыяй на вялікія пераўтварэнні ў нашым жыцці, быць адным з першых паэтаў-летапісцаў рэвалюцыі. Ён належаў да тых байцоў, якія ясна бачылі сваю мэту і непахісна ішлі з народам праз усе нягоды і выпрабаванні. Аб усім перажытым ён расказаў у сваіх творах. Расказаў цікава, праўдзіва, з натхненнем і любоўю. Многія яго творы ўвайшлі ў скарбніцу нашай шматнацыянальнай савецкай літаратуры, якімі па праву мы ўсе ганарымся.

Хай будзе табе лёгкай родная зямля, якую ты любіў шчырай сыноўняй любоўю, хараству і шчасцю, якой ты прысвяціў усё сваё творчае жыццё паэта, грамадзяніна, камуніста.

Бывай наш дарагі дружа, Пятро Фёдаравіч. Ты заўсёды будзеш жыць у сваіх паэтычных песнях, у сэрцах сваіх шматлікіх сяброў, у сэрцы свайго народа.

Выступае дырэктар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы акадэмік АН БССР В. В. Барысенка.

— Наша акадэмія навук у глыбокай жалобе. Разам з намі смуткуе з выпадку цяжкай утраты — смерці незабыўнага Пятра Фёдаравіча Глебкі ўся творчая інтэлігенцыя.

Цяжка вымавіць слова нябожчык аб чалавеку, з якім давялося працаваць шмат гадоў поплеч. Больш як 25 гадоў сваёй напружанай працы Пятро Фёдаравіч аддаў Акадэміі навук БССР. На любой рабоце — няхай гэта будзе на ніве літаратурнай працы, у навуковай або грамадскай дзейнасці — усюды Пятро Фёдаравіч аддаваў сябе цалкам, як і належыць сапраўднаму патрыёту.

Бывай, наш дарагі друг!

Затым выступіў намеснік міністра культуры БССР Ю. М. Міхневіч.

— Дарагія таварышы! Вельмі цяжка сёння выступаць каля гэтай труны. Няма з намі незабыўнага Пятра Фёдаравіча Глебкі і ў гэта цяжка паверыць. У нас перад вачыма стаіць жывы вобраз Пятра Фёдаравіча, выдатнага паэта, грамадзяніна, чалавека. Перад яго трунай схіляюць сёння галовы не толькі пісьменнікі і вучоныя, глыбокую жалобу прынеслі сюды разам з нашым народам работнікі мастацтва і культуры. Ён зрабіў вялікі ўплыў на развіццё многіх галін мастацтва, культуры і мовазнаўства, этнаграфіі і фальклору.

Такія людзі, як Пятро Фёдаравіч Глебка не паміраюць. Увесь свой талент, усе свае сілы аддаваў ён вялікай справе будаўніцтва новага грамадства, свайму народу.

Мы праводзім Пятра Фёдаравіча ў апошні шлях, але ў сэрцах нашых ён застанецца назаўсёды.

Ад імя землякоў Пятра Фёдаравіча Глебкі выступіў загадчык навучальнай часткі Літвянскай сярэдняй школы П. І. Махнач.

— Сёння мы праводзім у апошні шлях народнага паэта Беларусі, вучонага, нашага дарагога земляка Пятра Фёдаравіча Глебку. З малых гадоў наш славуты зямляк хадзіў за плугам па роднай зямлі, касіў травы ля любімай ракі Усы. Але мінулі гады, і Пятро Фёдаравіч Глебка стаў вядомым беларускім паэтам. Кожны яго новы верш, кожная яго новая кніга радавала нас і выклікала пачуццё гордасці.

У асобе Пятра Фёдаравіча наш народ страціў вернага сына радзімы, палымянага патрыёта, які ўвесь свой талент і сілы аддаваў служэнню народу.

Светлая памяць аб Пятру Фёдаравічу назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах. Бывай, наш дарагі Пятро Фёдаравіч.

■

Мітынг аб'яўляецца закрытым. Пад гукі жалобнага маршу жалобны картэж кранаецца ў дарогу. На могілках па Маскоўскай шашы ўсе яшчэ раз развіталіся з П. Ф. Глебкам. Надмагільныя словы сказалі сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР І. П. Шамякін і дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору В. К. Бандарчык.

Зноў гучыць жалобная мелодыя, калі труну апускаюць у магілу. Праз некалькі мінут узгорак над магілай пакрывае зеляніна шматлікіх вянкоў.

БЕЛТА.

Міністэрства культуры БССР глыбока смуткуе з прычыны смерці выдатнага беларускага пісьменніка, акадэміка-сакратара аддзялення грамадскіх навук Акадэміі навук БССР, дэпутата Вярхоўнага Савета БССР Пятра Фёдаравіча Глебкі і выказвае спачуванне сям'і нябожчыка.

Калектыў супрацоўнікаў Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку глыбока смуткуе з выпадку цяжкай утраты — смерці вядомага беларускага пісьменніка, акадэміка-сакратара аддзялення грамадскіх навук Акадэміі навук БССР, акадэміка АН БССР Пятра Фёдаравіча Глебкі і выказвае спачуванне сям'і і блізкім нябожчыка.

Беларускае тэатральнае аб'яднанне глыбока смуткуе аб смерці выдатнага беларускага паэта акадэміка П. Ф. Глебкі і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Саюз кампазітараў БССР глыбока смуткуе з прычыны смерці выдатнага беларускага пісьменніка, друга беларускіх кампазітараў Пятра Фёдаравіча Глебкі і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Калектыў супрацоўнікаў і рэдкалегія часопіса «Беларусь» глыбока смуткуюць з прычыны смерці члена рэдкалегіі, выдатнага паэта і вучонага Пятра Фёдаравіча Глебкі і выказваюць спачуванне сям'і памёршага

Калектыў рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» выказвае глыбокае спачуванне былой шматгадовай супрацоўніцы рэдакцыі Ніне Іларыёнаўне Глебка з прычыны заўчаснай смерці яе мужа — Пятра Фёдаравіча Глебкі.

СУВЯЗІ, ПЕРАКЛАДЫ, ВЫДАННІ

З пасяджэння секцыі мастацкага перакладу Саюза пісьменнікаў БССР

Адбылося чарговае пасяджэнне секцыі мастацкага перакладу Саюза пісьменнікаў Беларусі з удзелам шырокага актыву пісьменніцкай арганізацыі рэспублікі. Адкрываючы пасяджэнне, старшыня бюро секцыі Язэп Семяжон адзначыў, што пытанні ўзаемасувязей беларускай літаратуры з літаратурамі братніх савецкіх рэспублік, сацыялістычных краін і прагрэсіўнымі літаратурамі капіталістычнага свету, стан беларускага мастацкага перакладу і выдання перакладных твораў у рэспубліцы надзвычай надзённыя. Іх надзённасць дыктуецца яшчэ і тым, што ў пачатку будучага года ў Маскве мае адбыцца IV Усесаюзная нарада па пытаннях інтэрнацыянальных узаемасувязей савецкай літаратуры і мастацкага перакладу.

Беларуская савецкая літаратура стала неад'емнай часткай сусветнай літаратуры, падкрэсліў прамоўца. Год ад году павялічваецца колькасць перакладных твораў нашай літаратуры на замежныя мовы, творы нашых пісьменнікаў уваходзяць у духоўны ўжытак чытачоў усё новых і новых краін свету. У сваю чаргу, і наша нацыянальная літаратура больш аператыўна вывучае і даносіць да нашага чытача ўсё найбольш каштоўнае з мастацкіх здабыткаў іншых народаў, з кожным годам павялічвае колькасць мастацкіх перакладаў з іншых літаратур на беларускую мову. Шырокаму азнаямленню нашага чытача з лепшымі творамі сусветнай літаратуры спрыяюць сістэматычныя публікацыі мастацкіх перакладаў у перыядычных выданнях і выпуск іх у выдавецтвах. На жаль, зазначае Я. Семяжон, у гэтай справе, асабліва ў колькасных адносінах, у нас шмат яшчэ пралікаў і недахопаў.

Спыняецца прамоўца і на сучасным стане майстэрства беларускага перакладу. Беларускі мастацкі пераклад, асабліва пераклад паэтычны, дасягнуў бясспрэчных поспехаў. Беларускі чытач з пачуццём удзячнасці па-праву называе імёны беларускіх паэтаў і перакладчыкаў, якія далі яму магчымасць і асалоду прачытаць на роднай мове Шэкспіра і Міцкевіча, Шота Руставелі і Шылера, Лермантава і Катлярэўскага, Байрана і Беранжэ, класічную і сучасную паэзію братняй Балгарыі і паэзію лужыцкіх сербаў. Толькі за апошнія два гады наш чытач атрымаў шэсць анталогій літаратур розных народаў свету — в'етнамскай лірыкі, паэзіі ГДР, італьянскай навелы, польскага апавядання, серба-лужыцкай паэзіі і г. д.

На пасяджэнні выступіў сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Янка Брыль. Ён паведаміў, што з Дзяржаўнага камітэта па друку пры Савеце Міністраў БССР у Саюз пісьменнікаў паступіла прапанова — выказаць свае меркаванні аб мэтазгоднасці выдання ў рэспубліцы перакладной літаратуры дзвюма серыямі — «Лепшыя творы сусветнай літаратуры» і «Галасы сяброў». У першай серыі будуць выдавацца творы класічнай і сучаснай сусветнай літаратуры, у другой — лепшыя творы братніх савецкіх літаратур і літаратур краін сацыялістычнага лагера. Я. Брыль падкрэсліў, што прыняцце гэтай прапановы будзе садзейнічаць ўпарадкаванню і значнаму пашырэнню выданняў перакладной кнігі ў рэспубліцы, бо да гэтага часу выданне такіх кніг у выдавецтве «Беларусь» насіла ў асноўным юбілейны альбо «дэкадны» характар.

Далей Я. Брыль знаёміць прысутных з праспектам перспектыўнага плана выдання перакладных кніг выдавецтвам «Беларусь» на бліжэйшыя пяць гадоў. Прамоўца падкрэсліў, што ў гэтым плане павінны абавязкова быць такія кнігі, як творы савецкіх пісьменнікаў, адзначаныя Ленінскімі і Дзяржаўнымі прэміямі, анталогіі ўкраінскай і грузінскай паэзіі, кніга апавяданняў пісьменнікаў Індыі, паасобныя кнігі латышскіх, літоўскіх, украінскіх і іншых пісьменнікаў братніх літаратур Савецкага Саюза, а таксама такія жамчужыны сусветнай літаратуры, як «Пан Тадэвуш» Міцкевіча і «Фауст» Гётэ. Пажадана таксама, каб гэты план прадугледжваў выданне асобных кніг паэзіі Ясеніна, Платона Варанько, Андраса Веяна, Альбінаса Жукаўскаса і многіх іншых у перакладах аднаго паэта. Гэтую ініцыятыву творчага «суперніцтва» паэта з паэтам неабходна вітаць і падтрымліваць.

Перакладчык Леў Салавей расказаў на пасяджэнні аб рабоце рэдакцыі перавыданняў і перакладной літаратуры выдавецтва «Беларусь». У прыватнасці, ён паведаміў, што распрацаваны і абмяркоўваецца пяцігадовы перспектыўны план выдання перакладной мастацкай літаратуры, які прадугледжвае выпуск не менш 50 кніг замежных аўтараў, гэта значыць, па 10—12 кніг у год. Акрамя таго, за гэты ж час плануецца выдаць яшчэ 20—25 кніг перакладаў сусветнай класічнай літаратуры. Прыкладна столькі ж перакладных кніг прадугледжваецца выпусціць па рэдакцыі літаратуры для дзяцей і юнацтва.

Аляксей Зарыцкі, Васіль Вітка, Ніл Гілевіч, Аркадзь Марціновіч, Алесь Бачыла, Эдзі Агняцвет, Ядвіга Бяганская і іншыя таварышы ў сваіх выступленнях падтрымалі ідэю выдання перакладных кніг серыямі, гаварылі аб наспелай неабходнасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў перакладчыкаў і рэдактараў перакладных кніг, падкрэсліваючы, што падрыхтоўку перакладчыкаў з братніх моў народаў СССР і сацыялістычных краін трэба ажыццяўляць шляхам узаемнага культурнага абмену, непасрэдных пісьменніцкіх кантактаў і працяглых узаемных камандзіровак паасобных літаратараў з мэтай дэталёвага азнаямлення з краінай і ўдасканальвання ў вывучэнні мовы.

На неабходнасць выхавання кадраў кваліфікаванай крытыкі перакладной прадукцыі беларускіх пісьменнікаў гаварылі перакладчыкі П. Стэфановіч і М. Татур.

Усе таварышы, якія прымалі ўдзел у пасяджэнні, адзначылі, што гаворка была зацікаўленай, канструктыўнай і патрэбнай. Разам з тым удзельнікі пасяджэння лічаць, што наспела патрэба больш шырокай гаворкі на гэтую тэму, прысвяціць ёй спецыяльны пленум праўлення Саюза пісьменнікаў альбо, у крайнім выпадку, пашыранае пасяджэнне прэзідыума праўлення. Пытанні інтэрнацыянальных узаемасувязей беларускай літаратуры застаюцца актуальнымі, не знімаюцца з парадку дня.

На пятым з'ездзе партыі Горкі запрасіў Леніна прыехаць да яго на востраў Капры разам з Надзеяй Канстанцінаўнай. «Пагрэцца на паўднёвым сонейку, — як ён казаў, — высушыць лонданскую сырасць». Уладзімір Ільіч стрымаў абяцанне і прыехаў у Італію. Праўда, без жонкі.

Горкі сустрэў Леніна ў Неапалі. Яны доўга хадзілі па горадзе, аглядалі яго прыгажосці і быт, не абмінулі і гістарычны музей, у якім размешчаны унікальныя экспанаты ад этрускаў да канца Рымскай імперыі. Горкі, які не раз быў у гэтым музеі, як дасведчаны гід, тлумачыў Леніну паходжанне і месца знаходак многіх ваз і стэл, скульптурных фігур, розных іншых прадметаў глыбокай старажытнасці.

На другі дзень Ленін і Горкі ўзыйшлі на Везувій, потым паехалі ў Пампею, каб паглядзець, што нарабіў гэты няўрымслівы волат.

Пра ўсё гэта напомніў нам капітан нашага лайнера, малады чалавек, які зусім не нагадваў «марскога ваўка», так маляўніча апісанага ў раманах Майн Рыда. Ён паведаміў, што і мы заўтра раніцою паедзем у Пампею, а пасля на востраў Капры па ленінскіх сцежках.

...І вось Пампея—найвялікшы музей свету, горад, выкапаны з попелу Везувія, вогненная лава якога спаліла ўсё жывое, але пакінула амярцвелыя скамянеласці. Ідзём па каменных вуліцах, на якіх яшчэ захаваліся глыбокія каляіны ад калясніц. Тыповы антычны горад ранняга перыяду рымскай імперыі жыў дваццаць вякоў назад. Ён такім жа праўстае перад вачыма і сёння. Вось цэнтральны форум, абкружаны з усіх бакоў грамадскімі будынкамі. Тут гандлёвыя палаты пад вялікімі стракатымі тэнтамі, храмы Апалона і Юпіцера, школа і базіліка, залы суда і турма. У канцы горада велічэзны амфітэатр з казармамі для гладыятараў, гасцініцамі для прыезджых гледачоў і клеткамі для звяроў. Вуліцы горада запоўнены жылымі дамамі-пячорамі, у якіх, відаць, жыла пампейская бедната і рабы. Майстэрні рамеснікаў мяжуюць з пякарнямі і дробнымі крамамі, студні—з кузнямі. У жылых дамах багатых пампейцаў унутраныя двары з пышнай зелянінай і альтанкамі. Скульптуры ўпрыгожваюць не толькі фантаны, але і пакоі дамоў. Амаль ва ўсіх канцах горада спецыяльна высечаныя на сценах дамоў знакі паказваюць дарогу да цэнтральных лазняў горада. Тут, відаць, заўсёды было ажыўлена і людна, у гэтых рымскіх тэрмах з халоднай і гарачай вадой, з глыбокімі ацепленымі нішамі для адпачынку і прасторнымі басейнамі для купання. Тут стомлены падарожнік мог атрымаць свежую прасціну, заказаць лячэбны масаж і націранне араматычнымі масламі.

Можна ўявіць трагедыю пампейцаў, калі аднойчы ціха драмаўшы Везувій прачнуўся, заблішчалі маланкі, загрымелі перуны, у неба ўзляцелі асколкі скал. З нетраў зямлі вырвалася ў паветра велічэзнае полымя і ўсё спапяляючая магма палілася па цудоўнай, выпешчанай зямлі.

Калі на другі дзень плылі невялікім старым параходзікам з Неапаля на востраў Капры, мастак Расціслаў Трафімавіч не без яхіднасці запытаў у мяне і нашай спадарожніцы Ніны Паўлаўны—ці былі мы ў пампейскіх тэрмах? Яго бежавыя вочы гарэзліва заблішчалі.

— Былі, а што? — са спакойнай абыякавасцю адказала Ніна Паўлаўна.

— Ну, я думаў, паколькі нас падзялілі на дзве групы, асобна на мужчын і жанчын, то вам можа і не паказвалі гэты цудоўны палац старажытнага сервісу.

— А вам ён спадабаўся?

— Не столькі тэрмы, колькі прыгожыя гетэры, што намаляваны там на сценах. Не глядзіце на мяне з дакорам, Ніна Паўлаўна. Вядомыя нямецкія філосафы браты Шлегель, між іншым, лічылі рымскіх гетэр не толькі ідэалам антычнай прыгажосці, але і высокаадукаванымі ўрачамі, якія лячылі чалавечае цела і душу.

— Не ведаю, што там гаварылі пра пампейскіх гетэр браты Шлегель, але яны, таксама як і вы, перш за ўсё былі мужчынамі. Па-другое, сучасная гетэра наўрад ці можа быць параўнана з рымскай. Адным словам, калі вам, як мастаку, неабходна голая скура, вы можаце запрасіць да сябе натуршчыцу, але яна не зробіць вам ні масажу, ні націрання лячэбнай маззю, натуршчыца можа толькі пазіраваць. Што ж да гетэр, якімі захапляліся мастакі і філосафы, то яны ў часы жаночай заняволенасці шукалі ў дужых людзей заступніцтва.

— Вось вы заўсёды чытаеце мне лекцыі, а я хацеў бы, каб і вы хоць раз забылі, што жывяце ў наш час...

Мы падплывалі да вострава Капры. На цудоўных берагах, пакрытых залатым пяском, пераліваюцца дыяментамі хвалі. Па ўступах гор растуць цытрусы, пахучыя кветкі, пышная паўднёвая зеляніна, блішчыць на сонцы калейдаскоп хацін, багатых віл. Над імі павольна, што сокал над кручамі, уздымаецца фунікулёр. З вышыні вострава на пляжным узбярэжжы відаць раскошныя санаторыі. Тут, на вяршыні, цішыня і прахалода.

— Максім Горкі ведаў, дзе выбраць куток для лячэння і творчасці,—уздыхнула паэтэса Яснацвет.—Не хімічныя прэпараты, а жывая гаючая прырода давала яму сілы. А можа гэта ўсё арганізавала Андрэева, незвычайная жанчына, якую Ленін называў «фенаменам».

— «Фенаменам» толькі ў падполлі, а пасля рэвалюцыі Уладзімір Ільіч называў яе «камісарам па справах мастацтваў».

Мы ішлі па гары, сярод скал і мімоз. Утрамбаваная вякамі сцяжынка прывяла да вілы, дзе некалі жылі Горкі і Андрэева. Сапраўды, толькі ўлюбёнае жаночае сэрца і паэтычны неспакой буравесніка маглі адшукаць такое арлінае месца ў маляўнічым, але вельмі сціплым сяленні вострава Капры, на самай яго вяршыні. З вокан пакояў, дзе жыў пісьменнік, адкрываецца цудоўны від на неабсяжны прасцяг мора і неба.

Мы падумалі пра Марыю Фёдараўну, яе чулую душу, высокі розум, самаахвярнае сэрца. Па волі лёсу пайшла яна за вялікім чалавекам, велічная і прыгожая, таленавітая і разумная, суровая і дужая, пяшчотная і лагодная.

— За адзін год жыцця Андрэевай я аддала б дзесяць гадоў свайго!—усклікнула Чарская і пачырванела. Ёй здалося, што яе могуць няправільна зразумець. Але, відаць, кожны з нас быў заняты сваімі думкамі ў гэтых невялікіх пакойчыках, дзе бываў Ленін.

— Яе жыццё — подзвіг, — парушыла ўрачыстую цішыню Ніна Паўлаўна. — Жанчына-маці, рэвалюцыянерка, таленавітая актрыса, пісьменніца і выдатны грамадскі дзеяч. Я не ведаю больш дасканалага спалучэння такіх выдатных якасцей у адной жанчыны.

— Для многіх яна загадкавая нават зараз, калі яе ўжо няма, — заўважыла Яснацвет.

— Гэтую загадкавасць выдумляюць пісьменнікі, — адказала Ніна Паўлаўна ўсхвалявана.—Проста жанчына больш глыбока і верна любіць. Успомніце хоць бы тую ж Аніту Гарыбальдзі, якая са сваім мужам змагалася за народ на гэтай італьянскай зямлі. Палюбіўшы ўсім сэрцам няўрымслівага Джузэпе, яна кінула ўсё і пайшла разам з ім на пакуты і смерць.

— Па-мойму каханне і дружба пачуцці блізкія,—сказала Яснацвет,—адно нараджае другое. А Горкага з Андрэевай яднала адзінства светапогляду. Ленін вельмі паважаў і любіў Горкага і Андрэеву, спрыяў іх няй дружбе. Ленін даваў ім вельмі адказныя партыйныя даручэнні і, калі Горкі стаў вяшчальнікам рэвалюцыйных ідэй у сваёй творчасці і выступленнях, то Андрэева выдатна арганізоўвала іх прапаганду. Андрэева мела фенаменальны ўплыў на людзей. Яе жаночая прывабнасць і прыгажосць, высокі інтэлект і дыпламатычная элегантнасць у абыходжанні дапамагалі ёй быць выдатным канспіратарам. Яна магла аднаачасова прымаць у сябе на кватэры маскоўскага обер-паліцмайстра Трэпава і хаваць камуніста Баўмана, якога шукала паліцыя.

— Нічога дзіўнага, у Марыі Фёдараўны быў прыроджаны артыстызм.

Уважліва слухаючы паэтэсу, мы непрыкметна падышлі да славутай тэрасы, на якой Ленін гуляў у шахматы з Багданавым, калі гасцяваў у Горкага. Уладзімір Ільіч аднойчы зрабіў рашучы ход канём і Багданаў разгублена прызнаў:

«Вы мяне перамаглі. Вы, відаць, добра засвоілі не толькі філасофію Маркса, але і яго гульню ў шахматы».

«Я вас яшчэ перамагу і ў філасофіі,—засмяяўся Ленін.—І ніякі боженька вам не паможа».

Калі ўсе пасля аматарскага чэмпіянату спускаліся з гары на прыстань, каб за перамогу выпіць славутага кіпрскага белага віна «К'янці», Ленін, не перастаючы захапляцца цудоўнай прыроднай вострава, гаварыў Горкаму:

«Падумайце, такое хараство навокал, такое багацце зямлі, а гляньце на гэтых схуднелых рыбакоў. Яны хмурыя і маўклівыя. І гэта ў Італіі, у краіне песні і музыкі. Ім няма чаму радавацца, няма ў што верыць».

«Вось-вось, а вы хочаце адабраць у іх бога, Уладзімір Ільіч»,—сказаў Горкі.

«Вы гэта са слоў Багданава?»

«Чаму толькі Багданава? І Базарава, і Луначарскага, а яны вельмі таленавітыя людзі».

«Вы, як чалавек і мудры пісьменнік, можаце і нават павінны ведаць усе філасофіі свету...»

«Ідэалістычныя таксама?»—прыкрываючы лахматымі бровамі вочы, хітра запытаў Горкі.

«Так, і ідэалістычныя, — пацвердзіў Ленін.—вядома, з крытычнымі да іх адносінамі. Я ўпэўнены, вы самі зразумееце, куды вядзе боженька. Але ўсё ж паменш на яго спадзявайцеся. Зашпіліце кіцель, каб марскі брыз не нарабіў вам бяды, а то і божа не дапаможа, колькі б вы на яго ні маліліся».—Ленін іранічна глянуў на Горкага.

«Зашпілюся. Але тут усё ж Капры, а не Лондан, дзе вы мяне ратавалі ад англійскай сырасці».

«Не я, а газавы камін»,—усміхнуўся Ленін.

«І пасля я вас запрасіў сюды зусім не для таго, каб мы сварыліся», — варухнуў вусамі Горкі.

«Спрэчка не ёсць сварка»,—сказаў Ленін.

І яны моўчкі пайшлі ўздоўж пірса.

Марыя Фёдараўна дагаварылася з адным чарнявым чычэроне, каб падвёз іх да блакітнага грота. Пачуўшы ад яе, што ў лодцы плывуць рускія, вясляр заспяваў.

«Ну, вось, чуеце, Уладзімір Ільіч, яны пяюць»,—усміхнуўся Горкі.

«Але гэта ж пра нашу Адэсу,—развёў рукамі Ленін.—Я вывучаю італьянскую мову і ўжо крыху ў ёй разбіраюся».

Ён уважліва слухаў няхітры спеў італьянца, а пасля цяжка ўздыхнуў і запытаў:

— Скажыце, маэстра, на вашай лодцы можна даплысці да Адэсы?..

■

Мы стаялі, абапёршыся на парэнчы тэрасы, і моўчкі ўяўлялі, вядома, кожны па-свойму, іх — Леніна і Горкага.

Гэтыя ўспаміны — аб падарожжы па Заходняй Еўропе, аб востраве Капры—тых мясцінах, дзе У. І. Ленін бываў разам з Горкім і Андрэевай.

Аўтар.

ІМГНЕННІ БАРАЦЬБЫ

МІЖНАРОДНАЯ ВЫСТАЎКА ФАТАГРАФІІ, ПРЫСВЕЧАНАЯ У. І. ЛЕНІНУ

Тры гадзіны спатрэбілася для таго, каб уважліва агледзець больш як 2 000 фатаграфій, прысланых у Маскву з шасцідзесяці краін свету. Тая акалічнасць, што маскоўская выстаўка прысвечана Уладзіміру Ільічу Леніну, не толькі вылучыла яе з раду міжнародных аглядаў фатаграфічнага мастацтва, але і надало ёй ярка выражаную сацыяльную і палітычную накіраванасць. Лепшым майстрам фотамастацтва пад сілу ствараць творы, якія носяць агульначалавечы, вечны характар, як, напрыклад, удалося гэта зрабіць фотакарэспандэнту ТАСС Валянціну Собалеву ў яго рабоце «Красная плошча. Да Леніна», якая ўдастоена Гран-пры маскоўскай выстаўкі. Фатаграфія, як і іншыя віды мастацтва, здольная разглядаць справы і ўчынкі нашых сучаснікаў як бы праз прызму ленінскіх ідэй, што і паказала выстаўка.

У маі 1921 года Уладзімір Ільіч Ленін зняўся з дэлегатамі X Усерасійскай канферэнцыі РКП(б). Побач з гэтай фатаграфіяй — вялікая серыя карэспандэнта Агенцтва друку Навіны Васілія Малышава «Ветэраны ленінскай гвардыі»: можа сярод іх ёсць тыя, хто здымаўся з Леніным у маі 21-га. Пётр Оцуп зняў Леніна ля кніжнай шафы ў крамлёўскім кабінеце, і гэту эстафету — Ленін і кнігі — нібы працягвае фотарэпартаж Эмануіла Яўзярыхіна з кнігасховішча Інстытута марксізма-ленінізма «Тут захоўваюцца рукапісы У. І. Леніна». У гэтых і многіх іншых фатаграфіях ленінская тэма вырашана свежа, дакладна, захапляюча, і ўся экспазіцыя паказвае ўплыў дзейнасці Леніна на ўвесь ход палітычнага і сацыяльнага развіцця чалавечага грамадства.

На гэты раз пастаральныя пейзажы, у якіх фатографы дасягнулі дасканаласці, партрэты, якія адлюстравалі прыгажосць дзявочых твараў, уступілі месца фатаграфіям-дакументам, якія адлюстравалі аблічча сённяшняга дня. Гэта работы вялікага палітычнага і сацыяльнага гучання. Іх аўтары выступаюць у якасці абвінаваўцаў, як, напрыклад, Ульрых Кольс з ГДР, які прадставіў на выстаўку серыю «Ахвяры Ізраільскай агрэсіі». Ён не прыдумаў гэтага, не перабольшыў, ён убачыў і зняў. Зняў дзіцячыя сандалі ў руінах дома, зняважаны твар селяніна, старога, які аказаўся без хаты. Ці толькі ж зняў! У самім адборы месца, часу і герояў — пазіцыі майстра, пазіцыя чалавека, якому чужое насілле.

Для фотажурналіста галоўнае — бачыць. Тое, міма чаго мы можам прайсці, не звярнуўшы ўвагі, раптам трапляе ў аб'ектыў фотаапарата і становіцца творам дакументальнага мастацтва. Італьянскі майстар Гастоне Ланцэлоці ўбачыў, як стары, схіліўшы галаву, праходзіць міма лаўкі, якую ўжо нехта заняў. Фатаграфію ён назваў «Спазніўся». Адно імгненне, але ўсё сказана, за гэтым жыццё чалавека, яго мінулае і бязрадаснае будучае. А побач фатаграфія італьянца Нікола Скафідзі «Мафія». Гэта ўжо адчай, даведзены да мяжы, хоць усё, што паказана на фатаграфіі, як бы зусім ціхамірнае. На тратуары распасцёрта цела забітага чалавека, на агароджы рэклама, а побач стаяць двое раўнадушных. На іх тварах ні слёз, ні жаху, таму фатаграфія і палохае: забойства, узведзенае ў правіла, забойства, якое стала не вартым увагі, забойства, якое злілося з буднямі.

Лагічны канец падобных узаемаадносін чалавека з грамадствам: выбух сацыяльны, палітычны, дзяржаўны. Лагічны канец — гэта фотарэпартаж Хорста Штурма з ГДР «Крывавы вялікдзень у Заходнім Берліне», які зняў сутычкі маладых людзей з паліцыяй, гэта серыя Луіса Бісбала з Венесуэлы «Моладзь змагаецца».

Сочыш позіркам па ўсеяных фатаграфіямі сценах і натыкаешся на кантрасты, нечаканыя і шматзначныя. Вось «Партрэты», серыя шведа К. І. Рэна. Шэсць фатаграфій манекеншчыцы: задаволеная, стомленая, задумлівая, усмешлівая, пагардлівая, пакрыўджаная. Прыгожая, як рэч, якую можна купіць. А зверху — два чорныя малышы засяроджана п'юць малако — фатаграфія Шарля Рвеняжыра з Танзаніі «Кубак гарачага малака». І тут жа партрэт старой жанчыны: гэта вядомая нямецкая актрыса Алена Вейгель (фатаграфія Хельмута Радаца з ГДР). І «Шахцёр» балгарына Аляксандра Раманава. Можа гэта не самыя выдатныя работы на выстаўцы, але, аказаўшыся ў суседстве з «Партрэтамі» шведскага майстра, яны набылі асаблівы падтэкст. Яшчэ і яшчэ раз угладаешся ў твары манекеншчыцы, шахцёра, старой актрысы, якія жывуць на адной зямлі, але ў розных светах.

Моцнае ўражанне робіць серыя «Англія» Томаса Гугіні са Швейцарыі. Само мастацтва гэтага фотамайстра — ацэнка грамадства, дзе грошы і знешні поспех сталі ледзь не адзінай меркай чалавечай каштоўнасці. І побач іншыя фатаграфіі: галодныя людзі, якія ідуць па пустэльных дарогах. Тыя, хто выкінуты за борт жыцця.

Ёсць у свеце рэчы, якія датычаць усіх: В'етнам ужо даўно стаў паняццем не толькі геаграфічным, а і маральным. Адносіны прагрэсіўных людзей да в'етнамскай праблемы адлюстроўваюць фатаграфіі, прадстаўленыя на выстаўцы. В'етнамскі народ павінен быць свабодны і шчаслівы, сцвярджаюць савецкі фотамайстар Валянцін Собалеў сваёй серыяй «Людзі гераічнага В'етнама» і Хуберт Лінк з ГДР, які прадставіў серыю «Твары В'етнама». Сюжэты здымкаў простыя, як простае ўяўленне аб шчасці, гэта мірная праца, гэта маці і дзіця, гэта ўрач перад аперацыяй. І побач фота То На з Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам «Амерыканскі сцярвятнік, збіты над Ханоем». А ў другім канцы выставачнай залы — таксама збіты самалёт: нямецкі знішчальнік узараў носам рускую зямлю. «Прызямліўся!» — названа фота Івана Шагіна.

Так пераклікнуліся В'етнам і Расія, тое, што адбывалася на савецкай зямлі ў Вялікую Айчынную вайну, і тое, што адбываецца ў В'етнаме. Адсюль наша стаўленне да в'етнамскай праблемы, адсюль боль савецкага народа за тое, што зараз адбываецца на далёкім і ў той жа час блізкім сэрцам паўвостраве.

Вартасць фотавыстаўкі ў тым, што яна паказала сучасны свет непрыгладжаным, такім, якім ён ёсць,— у барацьбе і супярэчнасцях.

Мікалай НАЗАРАЎ,
карэспандэнт АДН.

Галоўны рэдактар Л. Я. ПРОКША

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, К. П. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61; намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25; адказнага сакратара — 33-44-04; аддзела літаратуры — 33-21-53; аддзела тэатра кіно і музыкі — 33-24-62; аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62; аддзела публіцыстыкі — 33-22-04; аддзела культуры — 33-22-04; аддзела інфармацыі — 33-44-04; выдавецтва — 6-25-19; бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 АТ 19135